ПАЭЗІЯ

**Міхась Башлакоў**

# КАЛІ ЁСЦЬ ПЕСНІ, ЁСЦЬ ЖЫЦЦЁ...

*Вершы*



***Башлакоў Міхась Захаравіч*** нарадзіўся 27 красавіка 1951 года ў пасёлку Станцыя Церуха (цяпер вёска Баштан) Гомельскага раёна. Вучыўся ў Грабаўскай сярэдняй школе. У 1968 годзе паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт ГДУ, пасля заканчэння якога ў 1973—1978 гадах працаваў у вясковых школах на Гомельшчыне і Браншчыне. У 1978—1985 гадах выкладаў беларускую мову і літаратуру ў школах Гомеля. Пасля пераезду ў Мінск у 1991—2005 гадах працаваў галоўным метадыстам у Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь, актыўна займаўся падрыхтоўкай і выданнем 145-томнай гісторыка-дакументальнай хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць». Аўтар кніг паэзіі «Касавіца» (1979), «Дні мае залатыя» (1993), «Як слёзы горкія Айчыны...» (1999), «Матчыны грыбы перабіраю» (2000), «Світальныя коні» (2001), «Пяро зязюлі падніму» (2001), «Нетры» (2004), «Палын. Чарнобыль» (2005), «Віно адзінокіх» (2011), «Музыка нязваная» (2014), «Далеч вячэрняя» (2017), «На зветраных шляхах» (2020) і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (2009).

◆ ◆ ◆

Залаціцца на золку дарога пясчаная
І няспынна бяжыць у блакітны абсяг...
І жыццё, як лісцё, шапаціць несціханае
І махае крылом, нібы стомлены птах...

Азіраю прастор... Гэта неба высокае.
Гэты шлях між палёў, між густых каласоў.
Срэбны звон жаўрука недзе там, між аблокамі,
І да роднай зямлі гэта наша любоў...

О Радзіма мая, ты, як песня, дзівосная!..
Хіба можна раздолле тваё не любіць?..
Гэты луг і рака. І задумныя сосны.
І душа ад пачуццяў трапеча, шчыміць...

Я і ў думках ніколі не здрадзіў Айчыне...
Колькі вершаў найлепшых я ёй прысвяціў!..
Гэты вольны абшар. Гэты бор сіні-сіні.
Гэты шлях прамяністы між сонечных ніў...

◆ ◆ ◆

Мясціны родныя... Ды толькі вось нікога,
Каго я ведаў, з кім я сябраваў...
Бяжыць-бяжыць ад станцыі дарога,
Якою я бясконца шыбаваў...

Гурмою следам крочаць успаміны...
Пасёлак. Поле. Лес. І сенажаць.
Дубы і клёны. Гоман ручаіны.
Бярозы над дарогаю шумяць...

Як радасна, што зноў я сузіраю
Карціны дарагія даўніх дзён...
І роспачны, што многага не маю:
Сплыло ў нябыт, нібы юнацкі сон...

Але жыву і крочу вось дарогай,
Той, запаветнай, самай дарогой...
Шуміць лісцё... І дзякуй, дзякуй Богу,
Плывуць аблокі, клічуць за сабой...

◆ ◆ ◆

Палявыя разлогі...
На душы так лагодна.
Каласы ля дарогі
Штосьці шэпчуць пяшчотна.

Цені гушкаюць дрэвы
Над жытнёвым улоннем.
На зялёных угрэвах
Ціха пасвяцца коні.

Вёска. Хаты. Налівы
Пахнуць сонечным летам.
І такі я шчаслівы,
Што вакол усё гэта...

◆ ◆ ◆

У гэтай вечнай мітусні,
У гэтам быце несціханым
Знікаюць беззваротна дні,
Нібыта ў восеньскім тумане...

Вось так і коцяцца гады —
Не застаецца анічога...
І толькі нечыя сляды,
І толькі гэтая дарога...

◆ ◆ ◆

Ляцяць гадоў імклівых коні,
Без следу ўсё кудысь цячэ...
З кім, разважаеш, пагамоніш,
Хто жарам сэрца апячэ?..

І разумееш: вечарэе
Над цішай стомленых шляхоў...
Нат азірнуцца не паспееш:
Ані гадоў, ані сяброў...

І толькі гэта адзінота
Крылом гаркоты ахіне...
А ранкам глянеш — каля плота
Траву ўжо інеем кране...

І зноўку роспачна ўздыхаеш,
Што ўраз кудысьці ўсё сплыло...
Але ж было... Як квецень мая,
Усё, усё вакол цвіло...

◆ ◆ ◆

Фрагменты нейкіх успамінаў,
Абрыўкі нейкіх даўніх сноў:
То кліча родная сцяжына
Між спелых жытніх каласоў,

То сніцца школа за ракою,
Дзе я калісьці працаваў...
Усё даўно сплыло з вадою,
Аб чым ні думаў, ні гадаў...

Хіба мы думаем сягоння,
Што дзень сплыве за небакрай?..
А што зляцела — не дагоніш,
Як ты яго ні даганяй...

Цані, што маеш... Потым позна
Аб тым, што страціў, шкадаваць...
Цані вясну не ў дзень марозны,
А як за вёскай сенажаць

Люляе ў травах разнаквецце...
Жыві, рабі і ўсё цані:
І тое, што аклікнуў вецер,
І гэтыя, у квеце, дні...

◆ ◆ ◆

Успомніш зноў сяброў былых,
Якіх няма на свеце...
Усё ў жыцці, як нейкі міг,
Як плынь ракі ці вецер,

Што наляцеў, і дзень прапаў
У шумных хвалях пенных,
У мітусні штодзённых спраў...
Усё, усё імгненна...

Таму жыві, як Бог дае:
Праўдзіва, чэсна, годна,
Каб дні і справы ўсе твае
Не зніклі беззваротна...

◆ ◆ ◆

У думках роспачна шкадуеш:
Не змог, не здзейсніў, не паспеў
І што жыццё тваё ўпустую...
Але ж, як вецер, ты шумеў...

І налятаў, і штось шаманіў,
І словы светлыя шаптаў...
Не, недарэмна час свой бавіў
І недарэмна трапятаў,

Як той лісток за шклом асеннім...
Калі ёсць песні, ёсць жыццё...
А ўсё астатняе — адценні,
Як кажуць, проста пачуццё...



ПРОЗА

## Хведар Гурыновіч

# ВОДАР УЧАРАШНЯГА ЛЕТА

*Замалёўкі з натуры*

***Гурыновіч Хведар Хведаравіч*** нарадзіўся 14 верасня 1950 года ў вёсцы Крывічы на Салігоршчыне. Закончыў факультэт журналістыкі БДУ. Амаль 30 гадоў працаваў у газеце беларускіх шахцёраў «Калійшчык Салігорска»: карэспандэнтам, адказным сакратаром, рэдактарам. Аўтар больш чым трох дзясяткаў кніг паэзіі і прозы як на беларускай, так і на рускай мове. Сем з іх адрасаваны юнаму чытачу. Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі і літаратурнай прэміі імя Янкі Маўра. Заслужаны ветэран працы ААТ «Беларуськалій», Ганаровы грамадзянін Салігорскага раёна, Ганаровы член Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

Абезгалоселі далі, і там, дзе веснімі трэлямі страляў салавей, блукаю па каляным кустоўі з доўгай дубальтоўкай. З рэдкіх алешын спаўзае ў рудую траву хмель у напарстках пераспелых шышачак, ласіныя мухі мяркуюць учапіцца ў валасы, вецер разносіць па лазняку сарочыя плёткі, і дрэвы варочаюць вершаліны на поўдзень.

Сонныя гарадскія закавулкі адчайным выццём будзіць вецер. Вось нарэшце і з'явіўся час успомніць жыццё. Сумныя жураўлі расталі ў небе, і цяпер, адчуўшы гаркавы смак пенсійных пайкоў, разам з жонкай можам расставіць кропкі над «і». Перакроіць старызну, пахадзіць па сваяках, ды і ў рэшце рэшт патроіць клопат у зборы камянёў — каб не пакінуць зла ці якой крыўды. Цяпер будзе час — шчодры час на дваіх — няньчыць унукаў.

Ах, бабулечка мая, дай на цябе ўважліва паглядзець і весела ўспомніць наша ўчора. Цяпер і пад восеньскім дажджом, і калючай зімой мы з табой можам нават памарыць. Божа ж ты мой!

На пясчаным мелкаводдзі таўчэцца чародка печкуроў, і падобны на мыльніцу жук-плавунец спрабуе на іх паляваць. Ён дробненька грабе доўгімі і ўчэпістымі заднімі ножкамі, стараючыся нагнаць печкура, што адстаў ад астатніх. Але рыбка не дрэмле і пакідае лаўца далёка ззаду, даганяючы свой касячок.

І чалавеку ў гурце і бедаваць, і радавацца лацвей.

Паволі і бязгучна начное неба перасякаў спадарожнік — бяздомная, бадзяжная зорка, і астатнія, зусім нерухомыя, назіралі за ёй здзіўлена і з асуджэннем. У неймавернай цішыні ўсё больш выразна чулася ўласная душа і нейкі шчымлівы сардэчны боль.

Кажуць, хваробы ў чалавека пачынаюцца тады, калі колькасць пражытых гадоў перавальвае за памер нагі, а яны ўжо абагналі мой сорак першы больш чым на трыццаць гадзікаў. Але чуў і пра тое, што дапусціць немач не дае паляванне, чаму радасна верылася.

На дарозе ляжыць вуж, што не паспеў перапаўзці каляіну перад машынай. І хаця высахлая рэптылія, адпрасаваная дзясяткамі колаў, даўно ператварылася ў мумію, такса не адважваецца падысці да яе ўшчыльную. Мірта, відавочна, на ўсё жыццё запомніла, як мінулай восенню ў Гарадзішчах знячэўку напаролася на гадзюку, і цяпер абыходзіць бокам нават пакручастыя галінкі.

Уменне здзіўляцца лічу адной з самых станоўчых якасцей. А дзівос вакол хапае. Вунь хаця б той франтаваты зімародак з зялёнай галоўкай і такімі ж крыльцамі, з блакітнай спінкай, чырванаватай манішкай і залатымі шчочкамі ў чорнай абламоўцы, які мільгае над вадой, быццам смарагдавы ліхтарык. Вось ён, куляй даўшы нырца ў канаву, выскачыў з вады і сеў на ракітавую галінку, трымаючы ў шылападобнай дзюбцы сярэбранага карасіка.

Ці вось гэты бліскучы плоскі жучок — бронзаўка металічная, што з задавальненнем пашчыпвае хлебны мякіш, прапанаваны мной у якасці гасцінца.

Спякотна. Хочацца пакупацца. Пераязджаем мост цераз Лань і спыняемся. Шлюз падняты, таму вады ў рацэ па калені. А паўз берагі — залежы глею, спярэшчанага крыжыкамі куліковага клінапісу.

Заціснутая штучнымі насыпнымі валамі, вада імкнецца вышукаць свой першапачатковы маршрут і хаця б цячэннем абазначыць гістарычныя берагі. Але зрабіць тое не ўдаецца, і Лань пакорліва трапеча ў пракапаным экскаватарамі пенале.

Ватная, ціхая ранічка з зябкім дожджыкам. Але птаства спявае як нічога ніякага. Выдзяляецца чорны дрозд. Голас у яго меладычны, бадзёры, звонкі. Пэўна ж, наслухаўшыся начных салаўёў, пнецца іх пераймаць, спадзеючыся, што тыя не чуюць.

Ціха едзем лясной дарогай, і шлях нам паказвае заяц. Ён смешна клыпае за метраў трыццаць перад машынай, атрэсваецца ад дажджу, прысядае і ўсё нештачка вынюхвае ў каляіне, а то становіцца слупком і стрыжэ вушамі. Нарэшце да шарака даходзіць, што павінен саступіць дарогу.

У Смаглаве выў воўчы вывадак. Дасягаючы да звонкага неба, плылі чароўныя гукі звярынага хору — ад надта нізкага да самага высокага. Нема цягнуў жудасныя ноты важак, яму падпявалі пераяркі[1], тонка скуголілі прыбылыя[2].

Штосьці тужліва-жаласнае і спавядальнае ў працяглым паўночным выцці спалучалася з вясёлым і ўрачыстым. Здавалася, лес напоўнілі нетутэйшыя таямнічыя здані, а сухое палатнянае неба трымцела мільярдамі марозных зорак. Яны хваляваліся, пераміргваліся і разам з воўчым завываннем зліваліся ў адну

---

[1] Пераярак *(паляўн.)* — воўк мінулагодняга прыплоду.
[2] Прыбылы *(паляўн.)* — малады, з сёлетняга прыплоду.

шырокую песню. Што ў ёй было? Смутак ці весялосць, журба ці радасць? Не вытлумачыць гэтага, як і не перакласці воўчыя галасы на людскую мову.

Раней вехіры[1] былі да чаго ўжо асцярожнымі — чалавека за сотні крокаў абляталі. А цяпер настолькі прызвычаіліся да людзей, што селяцца не толькі ў вёсках, але і ў шумных гарадах. Вось і ў нас на лецішчы штогод галубіная пара выводзіць птушанят. Капаю градку, а вяхір сядзіць на яблыні нада мной і заўзята буркуе, а пасля прымосціцца на краечак бочкі, нап'ецца вады, пераляціць на бетонны электрычны слуп і зноў за сваё: «На ду-у-убе сяджу, на ду-у-убе сяджу!»

Эх, садовая твая галава, які ж гэта дуб?

Па ваколіцы ідзе чалавек з дубальтоўкай за спінай — вядома ж, паляўнічы. Ён не толькі вопытны следапыт таемных звярыных сцежак, але і паэт лесу, поля, лугу, балота; ён ведае пра ўсе іх радасці і складанасці і па-асабліваму, ва ўсім хараства, адчувае колеры, пахі і гукі. Ён бачыць і чуе многа больш, чым дадзена звычайнаму чалавечаму воку і вуху. Да таго ж у паляўнічага ёсць чароўная магчымасць расказаць пра свае адчуванні тым, хто захоча зайсці ў яго свет, — жывы, квітучы, трапятлівы, нязменны і ў той жа час такі, што кожнае імгненне перайначваецца.

Верце гэтаму чалавеку.

У невымернай чорнай бездані гарацьзагадкава пераміргваюцца тысячы сузор'яў, і калі пільна ўгледзецца, абавязкова знойдзеш між імі жывы агеньчык. Ці гэта пасланец зямнога розуму, ці касмічныя прасторы баразняць невядомыя іншапланецяне?

Аднойчы давялося назіраць спадарожнік, які каўзацеў паміж зорак зігзагападобна. І нічога б дзіўнага, калі б рух той быў плаўным. Але зігзагі гэтыя ўлева-прама-ўправа-прама і гэтак далей паўтараліся пад прамым вуглом. Не мог сцяміць, як яно можа быць, паколькі лятальныя апараты зямлян да такога покуль не дайшлі.

Мусіць жа, у галаве кожнай птушкі ёсць неверагодны компас, бо ў адваротным выпадку як бы за тысячы вёрст знаходзілі свае буслянкі бацяны, шпакоўні — шпакі? А колькі маршрутаў, скажам, у дразда ці канаплянкі, што лётаюць па корм для птушанят, імгненна адшукваючы гняздо ў любым зарасніку!

Я ж, хоць і паляўнічы, а без сонца ў лесе блукаю, што ў лабірынце. Зраблю круг — і абавязкова на ранейшае месца выйду. Наколькі ж мы, людзі, не прызвычаены да дзікай прыроды!

Божа ясны, які ж прывабны занядбаны луг злева ад ледзь прыкметнай сцяжыны! Ён духмяна пахне краскамі, сярод якіх пераважаюць незнаёмыя мне, фарбаваныя цэдрай суквецці на тонкіх высокіх сцяблінах. Яны яшчэ не паспелі стаць белай ватай, іх залатое зарава нагадвае «Сланечнікі» Ван Гога. Вачэй не адарваць! Так было да нас? І калі нас не стане, луг гэтак жа будзе палымнець жаўцізной?

Абрываючы сумныя думкі, паперадзе громападобна выбухае сіні цецярук, ды так блізка, што паспяваю разгледзець яго пунсовыя, злёгку выцвілыя бровы. Ну і напалохаў жа, цярэшка, каб табе пуста было!

[1] Вяхір — адзін з відаў дзікіх галубоў.

Аднойчы мой сабака напароўся на сарачаня. Тое яшчэ як трэба і лётаць не ўмела. Але абараняўся жаўтароцік, што сапраўдны баец. Мірта яму хвост вырвала. Сарока без хваста! Больш смешнай і нягеглай птушкі, напэўна, нідзе не стрэнеш. Самую доўгую перыну ўзяў на памяць. Думаеце, яна чорная? Зусім не: на сонцы пяро пераліваецца ўсімі колерамі вясёлкі.

Дык вось чаму злётак так адчайна абараняў хвост!

Языкатае лісцейка на ракіце нагадвае стручкі гароху, што прыляпіліся да вецця, а на бярозах лісточкі кругленькія і велічынёй — як савецкая капейка. Ці не ад іх такі густы пах? Не, то за спінай духмяніцца чаромха. І штосьці шчымлівае, да болю знаёмае ў гэтым водары.

Успамінаю: так пахла ў нашай хаце пенай, калі мама мыла бялізну ў вялікіх ліпавых ночвах. Як жа ясна выплыў малюнак вясковага дзяцінства! Чырвоны, мокры ад пары і поту юны матулін твар. Яшчэ больш чырвоныя яе дужыя рукі сялянкі, што мітусяцца ў ночвах. Зліплыя, волкія валасы збіваюцца на лоб, і яна ўсякі раз закідвае іх назад энергічным рухам галавы…

Дразды квокчуць, а вось салаўі сённячы не галасістыя. Можа, таму, што вечар зябкі? Бо ўжо самы час распявацца. Во, адзін зразумеў мяне: зашчоўкаў. Але чаму так баязліва? Давай, родны, давай! Недзе далёка-далёка, мусіць, на кукурузішчы ля Крушнікоў, забубніў перад сном адзінокі касач[1].

І столькі шчасця і зачаравання ў перазовах познекрасавіцкага вечара! Не дай Бог звярам, і птушкам, і рыбе, згаварыўшыся, пайсці ў таемныя схованы, у падземныя рэкі, каб пакінуць чалавека сам-насам з яго ядзернымі бомбамі, з сінтэтычнай ікрой і жалезным рокам.

Вечар прыцьмянеў і сыпануў над намі прыгаршчы зорак. Сыходзімся да машыны. На поясе ў кожнага — па слонцы. Вось такіх даўганосікаў прыносіў у яснапалянскую сядзібу сусветнавядомы мудрэц з дапытлівымі вачамі дзіцяці. Упэўнены, што не за пісьмовым сталом, а ў веснім лесе, на цязе слонак, нараджаліся геніяльныя, спавядальныя творы пісьменніка.

Раскрыленае наваколле дрыготка засноўваецца лёгкай ружаватай смугой, трапятлівай, камякаватай парай клубяцца адапрэлыя тарфянікі. Яны чарнеюцца ад плёскату шырокага грачынага крылля. Крыклівыя чароды мігатлівым свячэннем асыпалі ворыва, азіміну, луг. Куды ні глянеш — усюды гракі: на кожным прасёлку, на кожным дрэве ў беразняку. Разам з хрыплівым узбуджаным карканнем усе куткі і закавулкі засяляе сакавік. З вясковых вуліц на кліч расталай зямлі спяшаюцца гаваркія ручаі.

А ў поле трактары выйшлі на сяўбу аўса па чарапку[2]. Невыпадкова ж ён просіць: «Кінь мяне ў гразь — буду як князь».

Быццам ястрабкі, лётаюць па восеньскім лесе вочы, прагна ўпіваючыся ў кожную купіну. Нарэшце пагляд спыняецца на жаўтлявай плямцы, што свеціцца з-пад іржавага лісця, прыпадняўшы якое захоплена ўсклікаеш: «Баравікі!» Халодныя, у зярністай расе, атласныя шапачкі — набакір, а карэньчыкі — пузатыя, што бочачкі, і чысценькія-чысценькія. Дый адкуль таму чарвяку ўзяцца, калі трава прыпудраная шэранню?

---

[1] Касач (*паляўн.*) — цецярук.

[2] Чарапок — лёд, які ляжыць пад пластом расталай глебы.



ПАЭЗІЯ

# Яўген Хвалей

# ІДУ ПА МАТЧЫНЫМ ДВАРЫ

*Вершы*

***Хвалей Яўген Іванавіч*** нарадзіўся 1 студзеня 1947 года ў вёсцы Белькаўшчына Стаўбцоўскага раёна. Скончыў Мікалаеўшчынскую сярэднюю школу імя Якуба Коласа (1965), філалагічны факультэт БДУ (1971).

Пасля школы працаваў у рэдакцыі стаўбцоўскай райгазеты «Прамень», пасля ўніверсітэта — дырэктарам Мінскага абласнога Дома народнай творчасці (1972—1975), на Беларускім радыё і тэлебачанні (1976—85), у выдавецтвах «Народная асвета» (1972), «Юнацтва» (1985—2002), «Мастацкая літаратура» (2002), часопісах «Крыніца» (2003), «Родная прырода» (2005—2006), газетах «Літаратура і мастацтва» (2004), «Весці Першамайскага раёна» г. Мінска (2007—2008).

Аўтар паэтычных кніг «Ярына» (1979), «Прычасце» (1983), «Зялёны прамень аеру» (1987), «Квадры памяці» (1992), «Прыстань віцінаў» (1996), «Дзе хвалі срэбна-залатыя» (2009), «Маёнтак» (2018), зборніка гумарыстычных вершаў «Год Парсюка» (2019), кніг аповесцей «Пацукі» (1990), «Прынцэса тусоўкі» (4 выданні —2000, 2008, 2012, 2017), «Анжэла з Былькаў» (2012), «Вяселле на Кіпры» (2012), «Не пакідай мяне, Аля» (2016), «Нож» (2020), раманаў «Серабрыстыя таполі» (2015), «А на беразе тым…» (2021).

Выдаў зборнікі вершаў і казак для дзяцей «Насціны гасціны» (1989), «Каця на планеце радапедаў» (1997), «Дзіва-сны дзяўчынкі Вікі» (2002), «Яблык з радзімкай» (2017). Лаўрэат рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты Купідон» (2012).

## НА БЕРАЗЕ СВІЦЯЗІ

На беразе Свіцязі сіняй
Два дрэвы стаяць, як адно,
Абняўшыся,
Сплёўшы галіны,
Глядзяцца ў празрыстае дно.

Клён і вольха,
Клён і вольха,
Нібы Янка,
Нібы Вольга.

Аб гэткім каханні калісьці
Марыў Міцкевіч Адам,
І можа, пад гэткім жа лісцем
Марылі ён сэрца аддаў.

Свяціць будуць сонца і зоры,
А ім тут да скону стаяць,
Вянок свіцязянскі, азёрны,
Нібыта вянчальны, трымаць...
        Клён і вольха,
        Клён і вольха,
        Нібы Янка,
        Нібы Вольга.
        Дзень і ноч,
        Адвячорак і ранне —
        І адно на дваіх каханне.

◆ ◆ ◆

Іду па матчыным двары,
Над ім — сінь-зорка угары...
Я ж — рэха даўняе ў бары,
Хоць і з душою маладою.
Ах, час мой, часе,
                    што з табою?
Няўжо не стрэцца мне з зарою
І з зоркай-вішняю,
                    якою
Я захапляўся тут вясною?
Цяпер хоць на жыццё я падкі,
А зоркі ўсе мае — ападкі...

# ВЕРШЫ З КАТАЛОНІІ

## КАЛЯ ПОМНІКА ШАПЭНУ НА МАЁРЦЫ

Сонца, а здаецца —
                    гукі дажджу
Зліваюцца ў вальсы, мазуркі.
Я па плошчы Шапэна хаджу,
І крыжую ля помніка рукі.

Гэтак мала творца пражыў,
Але помніць яго Маёрка:
Плыў сюды, сухоты лячыў,
Разам з ім Жорж Санд —
яго жонка.

І здавалася мора раялем старым —
Хвалі ноты выпісвалі часта.
І луналі высока мазуркі ўгары
Па-над востравам —
белыя чайкі...

## САЛЬВАДОР ДАЛІ. ГАРАДОК КЕДАКЕС

Мастак-дзівак...
Ён — Сальвадор Далі.
А я люблю ўсіх здольных дзівакоў!
З гор серпанціна бачу я здалі
Марскую бухту, шхуны рыбакоў.

І вось іду да помніка —
заве
Ён кульбачкай сваёй,
а ногі — накрыж.
Бялюткай яхтай дом яго плыве —
Паверхі, вокны, дзверы насцеж...

На мовах розных гарадок пяе —
З якіх краін турыстаў тут няма!
І куфаль піва ў бары падае
Мне чорны чалавек —
уцёк з ярма.

Напэўна, ён здалёк, з тае зямлі,
Дзе ўсе сланы — на тонкіх ножках,
Ну, гэтак, як карціна у Далі —
Пабачыць у музеі яе можна...

І мурашы там поўзаюць ля ног —
Такія завадныя,
як у Сальвадора.
Гадзіннік вадкі ён прыдумаць мог —
Пішы, сусветная кантора...

На кожным кроку чуецца —
ДАЛІ!
І бухта паўтарае гэта слова,
Каб вечна ўсюды дзівакі жылі:
Дзівацтва —
мастакоўская аснова.

ПРОЗА

# Людміла Воранава

# НЕЗВЫЧАЙНАЕ Ў ЗВЫЧАЙНЫМ

*Апавяданне*



***Воранава Людміла Віктараўна*** нарадзілася 22 лістапада 1962 года ў вёсцы Залацеева Зэльвенскага раёна. Скочыла Ваўкавыскае педвучылішча (1982), гістарычны факультэт БДУ (1990), факультэт філасофіі і культуралогіі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы пры БДУ (1995). Больш за 35 гадоў працавала ў сістэме адукацыі сталіцы: настаўніцай пачатковых класаў, выкладала сусветную гісторыю і гісторыю Беларусі, грамадазнаўства, сусветную мастацкую культуру, была намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце, дырэктарам школы. Аўтар трох зборнікаў вершаў і песень. Лаўрэат прэміі міністра абароны Беларусі (2019, 2023), конкурсу «Славянскі калейдаскоп» (2023).

Міла ўжо не першы раз, праязджаючы ля гэтай бензазапраўкі «Беларусьнафта», што знаходзіцца ля вёскі Вуглы на выездзе з Мінска на міжнародны гасцінец Масква — Брэст, адчувала нейкае трывожнае пачуццё віны, якое не праходзіла і не давала ёй, як раней, спакойна весці машыну, назіраць за прыгожымі беларускімі пейзажамі, слухаць ціхую музыку, якая часта дапамагала складаць радкі і нават цэлыя вершы.

Гэтае пачуццё з'явілася з той самай пары, калі аднойчы яна, заправіўшы, як заўсёды, бензабак сваёй залацістай «Мазды» і ад'ехаўшы ад запраўкі, глянула на слупкі, якія паказвалі колькасць бензіну ў баку, і ёй падалося, што ёй пералілі паліва. Гэта значыць, што яна заплаціла менш, а налілі больш, чым трэба, амаль на палову. Першы раз суцешыла сябе думкай: «А можа, падалося? Можа, усядзецца?»

Калі распавяла пра гэты выпадак сябрам, тыя толькі адмахнуліся: маўляў, кінь дурное, не думай!

— Яны, гэтыя супрацоўнікі запраўкі, яшчэ не столькі сабе ў кішэню накруцяць…

— Можа, і так… Але што ж гэта за трывожны неспакой? Сумленне? Ці нейкія знакі зверху? Можна, відаць, тлумачыць па-рознаму.

Нельга сказаць, што Міла была цалкам матэрыялісткай ці ідэалісткай. Хутчэй, нешта сярэдняе. У дзяцінстве, праўда, у яе жыцці здарылася бяда, але яна выжыла. Цудам выжыла, бо іншыя ад такой хваробы, як рак крыві, не выжываюць. А яна не проста выжыла, а і не ўспамінала, што гэтая хвароба была

ў маленькай дзяўчынкі, якая мела ўсяго некалькі гадкоў жыцця і яшчэ нічога кепскага не паспела зрабіць гэтаму свету. Можа б, і зусім ніколі не ўспомніла, каб не аповед маці. І як доказ — паперка з накіраваннем райбальніцы ў навукова-даследчы інстытут з такім страшэнным дыягназам. Вусна ж было сказана, што больш за месяц дзяўчынка не пражыве, што везці на лячэнне яе трэба ці самалётам, ці ў таксі на руках, каб не трэсла. Дзяўчынка ўжо не хадзіла, не хацела есці, кармілі яе сілком, а нейкія незнаёмыя лейкацыты множыліся і множыліся, з'ядаючы эрытрацыты (так на простай мове тлумачылі матулі дактары). Інстытут быў апошняй надзеяй для яе бацькоў і для яе. Але маці нікуды Мілу не павезла. Бабуля Марыля не дазволіла.

— Не пушчу! — загаласіла. — Ніхто яшчэ адтуль не вяртаўся! Такое малое дзіця — ды рэзаць, ды даследаваць? Ты спыталася, адкуль гэта хвароба прыстала да дзяўчынкі? Здаровая ж была з нараджэння! — бурчэла з дакорам на маці бабулька.

— А як жа, спыталася, — засмучона, са слязьмі на вачах, апраўдвалася маці. Можа быць ад вялікага стрэсу, казалі. У дзяцей яшчэ бывае ад спалоху.

— Ну вось, цяпер зразумела: Ігнатавы сабакі вінаваты. Трэба несці дзіця да Грэцкавай Ганны, пярэпалахі выліваць, — зрабіла выснову Марыля.

Сабакі сапраўды былі. Гэта бабуля памятае, як дзяўчынка крычала немым голасам, калі яе акружылі з дзясятак вялізных, з яе ростам, брахуноў, а дакладней, паляўнічых сабак, калі яна бегла за вёску на поле, дзе бабуля Марыля палола буракі. Цяпер і Міла ведала, чаго хацелі сабакі, — акраец хлеба з маслам, які яна трымала ў руках, прабягаючы праз выган, дзе жыў мясцовы паляўнічы Ігнат. Сабак тады ад яе адагналі дарослыя вяскоўцы. Бабуля нават сварылася з Ігнатам, але тое, што здарылася, ужо назад не адкруціш. Мілу вылечыла старая Ганна. Цэлы тыдзень бацькі насілі дзяўчынку да яе, дзе старая вылівала над яе галавой расплаўлены воск і нешта шаптала. З воску выліваліся галовы розных сабак, якія імгненна застывалі, і яна іх паказвала маці, хоць старой Ганне пра іх ролю ў хваробе ніхто не распавядаў.

Праз тыдзень Міла пайшла, як кажуць, на папраўку, нават есці сама папрасіла. Праз некаторы час хваробы як і не было. І самае неверагоднае, што ніводзін аналіз крыві пазней нават не нагадаў пра тое, што яна была, гэтая страшная хвароба. Пасля такіх выпадкаў людзі пачынаюць верыць ці ў Бога і дзякаваць яму, ці ў нейкую іншую звышнатуральную сілу. Пра Бога Міла тады і не думала, малая зусім была. Ды і што такое звышнатуральная сіла, таксама не ведала. А дзякаваць? Дзякавала, але старой бабулі Ганне. Навек запомніла старэнькую хатку з пачарнелага ад часу бярвення, на якую з вялікай падзякай заглядалася заўсёды, калі праходзіла ці праязджала па вуліцы. І вельмі плакала, калі маці аднойчы па тэлефоне сказала, што баба Ганна памерла.

Хаткі той даўно няма, на яе месцы збудавалі цагляны мур, але чамусьці ён стаіць пусты і там да гэтага часу ніхто не жыве. Можа, таму, каб людзі памяталі апошнюю жыхарку гэтага куточка, бабулю Ганну, якая ратавала многіх людзей.

Міла верыла ў тое, што нейкая нябачная чалавеку сіла над намі ёсць, што ёсць хтосьці больш разумны, чым людзі, больш магутны і абавязкова справядлівы. Нездарма кажуць, што зверху лепш бачна. І гэтае трывожнае адчуванне ў яе таксама невыпадкова. Таму яна вырашыла заехаць на запраўку і даплаціць за тое, што дасталося ёй неправамерна. Успомніла словы маці, якая ўсё жыццё паўтарала: «Не бяры чужога! Не радуйся знойдзенаму, бо хтосьці, мабыць, па ім плача». Міла ўявіла тую дзяўчыну, што стаяла на касе, адпускаючы ёй паліва, і думала: «А калі яна пераліла мне не адной, што яна атрымае ў зарплату, калі з яе вылічаць?» З гэтай думкай Міла пад'ехала да бензакалонкі.

ПАЭЗІЯ

# Лідзія Гардынец

# ТОЛЬКІ СЭРЦЫ НЕ СТУДЗІЦЕ

*Вершы*



***Гардынец Лідзія Міхайлаўна*** нарадзілася 29 красавіка 1952 года у вёсцы Аўгустова Валожынскага раёна. Пасля заканчэння Мінскага кааператыўнага тэхнікума працавала ў сферах гандлю Валожынскага раёна і г. Маладзечна. Першая публікацыя з'явілася ў валожынскай раённай газеце «Працоўная слава» ў 1967 г. Аўтар кніг «Саламяны капялюшык» (2004), «Ад твайго парога» (2011) і «Я сябрую з сонцам» (2023).

◆ ◆ ◆

Бэзавым пахам, пахам маленства
Раптам павеяла гэтай вясной.
Мой хутарок, мой прытулачак першы,
Бэзавы хутар пад Дайнавой.

Бэзавы водар — ён нас чаруе,
Хмарай ружовай над вёскай расце.
Голас бабулі, здаецца мне, чую:
— Як жа прыгожа бэз наш цвіце!

Хто б мог падумаць, што так разрасцецца
Кусцік, што некалі даў нам сусед.
Вось мы адчынім з табою акенца —
Кветачкі ручкай сваёю кранеш!

Трактар спяваў пераможна і гулка —
Поле калгаснае ўсё пашыраў.
Бэз жа чапляўся галлём за падмурак —
Памяць маю для мяне зберагаў:

— Можа, загляне хоць на хвілінку,
Як яе ўзрадуе майскі мой цвет!..
Позна прыехала тая дзяўчынка,
Не адшукала хутара след.

Штосьці не склалася і не збылося,
У часе згубіўся той бэз дарагі...
Памяць размыла дажджлівая восень,
Ды ўсё адбялілі глухія снягі.

Бэзавым пахам, пахам маленства
Раптам павеяла гэтай вясной.
Мой хутарок, мой прытулачак лепшы,
Бэзавы хутар пад Дайнавой.

## Караткевічу Уладзіміру Сямёнавічу

Ты такім доўгачаканым, звонкім,
Летнім ліўнем, сонечным дажджом,
Перуном над роднаю старонкай,
Што ёсць моцы грымнуўшы, прайшоў!
З-пад пяра не кроплі выляталі —
Срэбра найчысцейшага вузлы.
Не туман, а воблакі гарталі
Птушкі белакрылыя буслы.
Ты прайшоў, а за табою вецер
Вал дзвяты час ускалыхнуў.
Мову продкаў ты панёс па свеце
І знямелы свет яе пачуў.
Мы з табой любоўю ап'янелі,
Прамяністай вераю тваёй.
Нібы ўзнялі дужыя арэлі
Нас над роднай, любаю зямлёй.
Дыхаем паветрам тым сягоння,
Пад дажджом нястрыманым, сяўным.
Незмаўкальна звоняць у прадонні,
Песняй неўміручаю, званы.

## Лясная крынічка

Сцеле вясна свой сувой.
Сцежкай між зёлак — ігліца.
Час нараджэння тут твой,
Песня лясная — крыніца.
Светла глядзяць дзве сасны,
Кожны дзень дзякуюць Богу.
Тут, на пачатку вясны,
Выбраў ён гэту дарогу.



ПРОЗА

# Мацвей Лішын
# ДВА АПАВЯДАННІ

***Лішын Мацвей Віктаравіч*** нарадзіўся 29 лістапада 1987 года ў Гомелі. Скончыў факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Працуе педагогам-арганізатарам у ДУА «Сярэдняя школа № 226 г. Мінска».

## ВОСЕНЬ

Восень распранался.

Здаецца, што я ўпершыню дасканала прачуваю гэты час года.

Спыняцца хацелася на кожным кроку, таму што тая прыгажосць, якой напаўняліся дзённыя імгненні, абгортвала цёплым паветрам, рахманымі сонечнымі промнямі і сузіраннем, і гэта цалкам паглыбляла ў думкі.

Восень распраналася.

Яна нагадвала беласкурую дзяўчыну з доўгімі рудымі валасамі, што ліліся бурлівым вадаспадам па ладным стане.

Прырода замірала, ператваралася ў фотаздымак, нават не адразу можна было зразумець: сапраўды ўсё навокал ці не? І толькі зялёныя дыяментавыя вочы лісця, якое яшчэ не паспела пажоўкнуць, гулліва блішчалі, давалі разуменне, што гэта не звычайны кадр, а само жыццё.

Спякотны летні час даўно скончыўся, калі так можна сказаць: ён абрыдзеў сваёй весялосцю, таму саступіў месца ёй, самай загадкавай, меланхалічнай прыгажуні.

Час крадзецца. Маразы яшчэ далёка ад сапраўднага іх націску, таму дрэвы мільгацяць маленькімі агеньчыкамі.

Усё ідзе паступова.

Настолькі добра, нават можна патануць у гэтым асяроддзі.

Натуральны працэс ідзе самым лагодным чынам.

Але калі на хвілінку ўяўляеш сабе, што літаральна праз невялічкі час дрэвы асірацеюць, лісце ападзе і доўгія голыя галінкі аблюбуюць крумкачы, хрыплы голас якіх, нібы рэзкі, разбэшчаны гук скрыпкі, будзе разразаць шэры небасхіл, то на душы становіцца халодна.

Спыніся імгненне — ты цудоўнае!

Восень распраналася.

Неверагодна, але пах гэтай чараўніцы мы пачынаем адчуваць прыблізна на пачатку другой паловы жніўня.

Ён прыходзіць з ніадкуль, на невялічкае імгненне, уразаецца ў ноздры, і ў галаве нараджаецца думка: «Няўжо так хутка?»

Вядома, надвор'е можа яшчэ радаваць цёплымі днямі, але ночы пачынаюць набываць прахалоду.

І ўсяму гэтаму спрыяе тая самая «пстрычка».

Яна сімвалізуе адпраўны пункт, ад якога свет ідзе насустрач ранняму ўставанню на працу, храбусценню маленькіх пажоўклых шкілетаў пад нагамі і чаканню аўтобуса, што спазняецца на сем хвілін.

Раніца нараджае самыя разнастайныя думкі. Калі б я быў мастаком, то адна з карцін восеньскага цыкла мела б прыблізна такі сюжэт:

«Узгорак. Вакол сходаў, нібы ў калізеі, сабраліся людзі.

На самай вышыні стаіць голая дзяўчына, рост якой вышэйшы за сярэдні.

Доўгія рудыя валасы з плячэй пераходзяць на грудзі, быццам гадзюка павольна спаўзае ўніз.

Рукі крыж-накрыж абхопліваюць цела.

Кончыкі пальцаў глядзяць уверх.

Белая скура, да якой так хочацца дакрануцца, нібы аксамітавая.

Водар яе немагчыма пачуць, а толькі ўявіць.

Гэта сумесь ігліцы, лаванды, цытруса і зямлі пасля дажджу.

Валасы сухія.

Па скуры нетаропка сцякаюць кроплі... кроплі нечага патаемнага.

Сонечныя прамяні лашчаць неверагоднай прыгажосці стан.

Дзяўчыну прываблівае пільны позірк людзей, тым самым яна адчувае сваю ўладу над імі.

Яна нібы квітнее, але ў той жа момант нерухомая, быццам бронзавая скульптура эпохі Адраджэння.

Прыгажуня падобная да ружы, тонкая постаць якой пакрыта шыпамі, толькі ў нашым выпадку шыпы замяняюць маленькія кроплі вільгаці.

Зялёныя вочы дзяўчыны адлюстроўваюць супакой, вочы разявак — жах.

Такая Маці-Прырода».

Паветра.

Злосны і халодны вецер імчаўся па дварах, вуліцах і праспектах. Завываў сваю бязлітасную песню. Кранаў усё і ўсіх.

Ён не меў ніякага параўнання ні з летнім, ні з вясновым, ні нават з зімовым сваім братам.

Складвалася ўражанне, што гэты гарэза выконвае асаблівы загад, які заключаўся ў тым, каб дрэвы ў хуткім часе сталі голымі. Ніводнага лісточка не павінна застацца на тонкіх галінках!

Восень на пачатку свайго кіравання і восень у сярэдзіне — два абсалютна розныя часы.

Калі больш за першую палову верасня тваё адзенне не адрозніваецца ад летняга настрою, то бліжэй да дваццатых чыслаў кастрычніка змена бачная кардынальна.

Восень распранаецца, а чалавек паступае наадварот: ён дастае з шафы куртку, пальчаткі і шалік.

Калі паглядзець — гэта пара натхнення, узнікнення нечага новага, а пачынаць заўжды цяжка.

Працэсу стварэння спадарожнічаюць думкі рознага кшталту, у якіх вір ідэй можа прывесці да таго, што ўсялякае імкненне бессэнсоўнае.

Проста жыві! Навошта выдумляць ровар нанова? Круці колы далей. Усё самае лепшае зроблена да цябе — таму карыстайся на поўную моц.

Так пачынаецца кожная раніца майго шпацыру да аўтобуснага прыпынку.

Кубак кавы яшчэ не паспявае прынесці порцыю бадзёрасці, соннае цела не да канца разумее, які ў яго сёння настрой, а думкі ўжо лятуць тым самым парывістым ветрам, што пажынае плён працы Творцы, зразае лісце вострым языком паветранай плыні, раскідвае іх па глебе.

Тут і пачынаецца самая сапраўдная магія, і каб яна здзейснілася, трэба спыніцца.

Восень распранлася.

Жоўтае, рудое, барвовае лісце раскідана паўсюль.

Не ўсе галіны дрэў яшчэ асірацелі, але як толькі ўдарыць добры мароз, то нават самыя трывалыя паслухмяна палягуць, пакрыўшыся белым інеем.

Між гэтага відовішча, што нагадвала кірмаш ці блышыны рынак, я адчуваў сябе маленькім хлопчыкам, і яго вочы разбягаліся ад мудрагелістых рэчаў, імя якім Маскі.

А сапраўды, толькі ўявіце сабе, што ўсё апалае лісце і ёсць Маскі!

Розныя: прыгожыя і не вельмі, вялікія і маленькія, з доўгімі стрэлкападобнымі кончыкамі і агідныя, абпаленыя сонечным праменнем.

Нічога не нагадвае?

Тады вазьміце любы ўпадабаны лісток і паднясіце яго да твару... бліжэй!

Нічога не ўзнікае?

Пакружыцеся, заплюшчыце вочы, удыхніце, пачуйце пах зямлі, на якой яны ляжалі... І вы самі, не маючы таго на ўвазе, дакранаецеся да сакральнага, да першапачатковага, да самога жыцця.

Чым не магія?

Толькі будзьце ўважлівымі: між гэтай разнастайнасці вельмі шмат бруду, бо не ўсё тое золата, што блішчыць.

Ды і мы самі не настолькі чыстыя, аб чым сведчаць «маскі-шкілеты», якія хочаш не хочаш, а джаляць асой, нагадваюць аб мінулым.

Вось такая гульня. Што ні пажадаеш, мае супрацьпастаўленне.

Варта толькі захацець — і штодзённы, абрыдлы сваёй сталасцю свет зайграе новымі фарбамі, нават калі ты іх бачыш кожны дзень... кожную гадзіну... хвіліну... кожнае імгненне.

Толькі нам вырашаць, якім будзе СЁННЯ: аднастайнай дарогай праз сквер, дзе пахмурныя бацькі, не прачнуўшыся, вядуць малечу ў дзіцячы садок, альбо казачным шляхам паміж доўгімі прывідамі таямнічых дрэў.

...Толькі нам вырашаць!

## Вада

«Тра-парабам-парам-гарам...» — нешта незразумелае прагучала за акном.

Павекі аўтаматычна раскрыліся, бы пачулі будзільнік.

«Тарам-пам-пам-пам...» — назойліва ўдарыла па шыбе.

СПАДЧЫНА

# Уладзімір Гніламёдаў

# У ВОЙСКУ

*Раман. Частка другая. Пачатак*



## ЧАСТКА ДРУГАЯ

## I

Платонаў валодаў пэўным запасам цярпення і з цягам часу прывыкаў да ўсяго, але не заўсёды атрымліваў задавальненне. Не меў задавальнення і ад аднастайнасці казарменнага побыту. Манатонны армейскі парадак, частыя бессэнсоўныя і знясільвальныя вайсковыя заняткі не маглі, аднак, выцесніць з галавы ўспаміны пра Валю. Пакутліва чакаў ад яе пісьма. Атрымаў яго на Новы год, які сустрэлі па-вайскоўаму сціпла. Платонаў успомніў показку: «Як сустрэнеш новы год, так і правядзеш» і ўздыхнуў. Раніцай у ленпакоі паказвалі новы кінафільм «Балада пра салдата», які вельмі спадабаўся ўсім: быў шчыры і праўдзівы. Асабліва расчуліўся нампаліт Балбатаеў, некалькі разоў паўтарыў: «Маладой, а какой герой!»

У той жа дзень Анціпа Мардас прынёс пісьмо ад Валі. Платонаў, угледзеўшы яе почырк, уявіў яе самую, постаць, мілыя рысы твару, колер валасоў, прычоску. Нібы ўбачыў, як яна заплятае сваю тоўстую касу і закідвае за патыліцу. Прыгадаў нават водар яе духоў, тонкі і высакародны.

Адкрыў канверт. Апроч пісьма там ляжала засушаная кветка, ён узяў, панюхаў. Кветка не пахла — сухая. Высахла, пакуль дабралася да адрасата. Яна пісала:

«Мой мілы Вальдэмар!

Ужо трэці раз пачынаю пісаць і ўсё рву. Не тыя словы. Моцна хвалююся, слова лезе на слова, спатыкаецца і аддаляецца ад мяне. Усё думаю, ці моцна ты мяне кахаеш, ці не завёў якую. Ці помніш ты мяне, сваю Валечку, а то, можа, ужо і забыў, занядбаў? Ты павінен яшчэ болей зразумець, што я кахаю цябе, кахаю і чакаю, а гэта нялёгка. Успомню і ўздыхну, успомню і зноў уздыхну. Думаю толькі пра цябе. Я ніколі не перастану цябе кахаць. Сумую па табе, нядаўна перажыла жахлівы прыступ меланхоліі. Адчувала, што знаходжуся ў нейкім незразумелым стане. Як бы саламяная ўдава. Часам закрадваецца думка, што з нашым расстаннем страціла цябе назаўсёды. Я ўспамінаю, як добра было нам разам. Ці хоць трохі думаеш пра мяне? Ты ў мяне не выходзіш з галавы. Ой, як мне цябе не хапае! Ноччу прашумела навальніца, я чула, як грыміць. Чамусьці падумала, што гэта ты хочаш нешта мне сказаць. Але што?

У мяне ад думак аб табе часам нават баліць галава, тады я выходжу на свежае паветра і стараюся ні аб чым не думаць, але гэта рэдка ўдаецца. Мне становіцца не па сабе ад думкі, што магу страціць цябе...»

«Што значыць «страціць»? — падумаў ён. — Не Валя, а загадка». Чытаючы, ён адчуваў узрушэнне, адчуваў, як гулка білася ад яе слоў сэрца: «Надта ж яна перажывае...» Ад наплыву пачуццяў яго ажно кінула ў пот. Ён спыніўся, перавёў дых, а потым зноў пабеглі перад вачыма яе словы:

«...Устаю раніцай і не ведаю, што апрануць, каб табе спадабалася, бо ўяўляю, што ты побач. У жанчыны павінны быць прыгожымі і дагледжанымі і адзенне, і твар. Хіба не так? Але без цябе я нішто. Я захапляюся і ганаруся табой, ты ў мяне такі разумны! Я ніколі не пакіну цябе. Дарагі, калі хочаш западозрыць мяне ў нявернасці, то для гэтага ў цябе няма аніякіх падстаў. Я помню ўсё і не ўяўляю сабе, каб побач са мной быў яшчэ нейкі мужчына. Я нават не думаю пра каго-небудзь. Як ні кажы, а кожнае замужжа — рызыка. Ты і толькі ты. Вельмі чакаю, дзеля цябе гатова ахвяраваць усім. Вяртаюся з работы звычайна Кааператыўнай вуліцай, сустракае мама, вячэраем, слухаем радыё. Затым кладуся адпачываць. Адзначылі з мамкай Каляды. Мамка кажа: «Хто не святкуе Каля́ду, не мае ў доме ладу». Наладзілі сціплае застолле.

Учора на рабоце мне сказалі, што я дрэнна выглядаю, бледная. Бледная, бо перажываю за цябе. Ты запрашаеш прыехаць, адведаць цябе, але ж у мяне работа, шмат хворых, трэба аказваць дапамогу, лячыць. Плюс хатнія клопаты. Купілі з мамай падстаўку для радыёлы, падышла па колеры.

Ты называеш мяне мілашкай, мне гэта не надта падабаецца, называй мяне інакш, больш пяшчотна, як я называю цябе. Ты мой амант[1], — кажу я. Баюся ўсё ж такі, што здрадзіш. Па гэтай прычыне ў мяне бывае дрэнны настрой, ужываю антыдэпрэсанты, аддаю перавагу натуральным, ем моркву і капусту, п'ю настой шыпшыны і бруснічнага лісту. Гэтым самым атрымліваю гармон задавальнення. Дзеля гэтага таксама добра выпіць кубачак гарачага шакаладу. А табе б я раіла дабаўляць у ежу базілік і карыцу.

Вельмі хачу, каб сярод чужых людзей не змарнелі, не абсыпаліся пялёсткі з кветкі твайго кахання да мяне. Абяцаеш? Дык ты жэнішся са мной? Я гэтага вельмі хачу, і каб найхутчэй. Хачу шчасця і баюся, хаця кажуць, што шчасця баяцца не трэба, бо яго няма, затое ёсць каханне. Каханне маё — ты. Калі перастану цябе кахаць, дык хай згіну, як тая сучка ў лесе. Нікому не давай чытаць мае пісьмы, а то яшчэ пачнуць смяяцца. Ой, родны мой! Я цябе, дарагі мой амант, вельмі раўную. Не можа так быць, каб побач з табой не было жанчын, яны ж усюды. Прашу: не заглядайся.

На гэтым канчаю, цалую сто разоў і яшчэ сто.

Твая Валя.

P. S. Як ты спіш? На спіне ці на жываце? Калі спіш на спіне, то выбірай падушку больш цвёрдую, калі на жываце, дык мяккую. Успамінай пры гэтым мяне. Сумую па табе».

Пісьмо здалося яму вельмі прачулым, сардэчным, ён ледзь не задыхнуўся ад шчасця, ад наплыву радасці. У арміі ён стаў вельмі сентыментальны, усё набыло ў яго эмацыянальную афарбоўку.

Прачытаў яшчэ і яшчэ, дзівячыся красамоўству сяброўкі, потым згарнуў і паклаў у кішэнь гімнасцёркі, бліжэй да сэрца. Адразу пачаў думаць, як напісаць адказ, каб заспакоіць Валю, каб яна так не хвалявалася, не баялася, што ён здрадзіць. Дастаў з кішэні, разгарнуў і зноў прачытаў, задумаўся.

---

[1] Каханне (*фр.*).

Падышоў стары знаёмы Лбоў, з якім прыехалі сюды, у Сямёнаўку. Яго прызначылі на «двaццатку». Выраз твару ў Лбова, як заўсёды, нахабны.

— Ад яе? — папытаў ён, кіўнуўшы на пісьмо. У вачах пракінулася ўхмылка.

— Тут, стараслужачыя расказваюць, да нашага прыезду ў суседнім кубрыку павесіўся быў тэлеграфіст Іштван Цаба. Венгерац з Ужгарадскай вобласці. Рослы, кажуць, магутны хлопец. Калі працаваў на ключы, дык кожны раз дзве васьмёркі выбіваў, нібы камусьці ў каханні прызнаваўся. Запіску пакінуў, напісаў, каб нікога не вінавацілі. Яго дзяўчына прыслала пісьмо, у якім паведамляла, што змаглася чакаць і выходзіць замуж за другога. Зашмаргу зрабіў з кабелю, зачапіў за верхні ярус нараў і засіліўся. Ногі даставалі да падлогі, з рота вылез кончык чорнага языка. Тэлеграмай паведамілі родзічам, прыехалі хутка, праз дзень, забралі, каб пахаваць там, у сябе.

— Чаму ты мне гэта расказаў?

— Цікавае здарэнне.

— Шкада Цабу, калі такое з ім здарылася, — уголас падумаў Платонаў. — Каб хто пабач быў, псіхалагічную дапамогу аказаў, адгаварыў...

— Але ж яна і сука! — заключыў Лбоў. — Я б з такой невядома што б зрабіў...

Доўжылася ўжо другая палова студзеня, зіма ўваходзіла ў самую сілу, тэрмометр паказваў пад дваццаць градусаў марозу. Раз на два тыдні даводзілася ісці ў каравул, несці службу вартавога, спраўджваць абавязкі па ахове тэрыторыі. Зімой гэта складаней, чым летам. Платонаў неаднаразова ў гэтым пераканаўся. На гэты раз заступіў на варту з вечара.

— Ідзі, Платонаў, пасцеражы мароз! — фанабэрліва загадаў Мардас, прызначаны начальнікам каравула.

Давялося насунуць на сябе паверх бушлата гаматны, да пятаў, цяжкі кажух. Цяжкі, затое цёплы, грэе, а калі падняць каўнер, дык мароз не так шчыпле за шчокі і вушы. Улазіць, аднак, у пальцы, нягледзячы на рукавіцы з двума «пальцамі», асабліва калі трымаеш у руках аўтамат. Платонаў запахнуў кажух, павесіў зброю на плячо, надзеў рукавіцы, выйшаў на ганак. Шмат снегу, але дарожкі ачышчаныя. Накіраваўся да грыбка. Зыркай чырванню пракінулася над даляглядам студзеньская заранiца. Ён пастаяў пад грыбком, агледзеўся і рушыў далей, вырашыў пайсці ў абход ахоўнай тэрыторыі. Абавязак вартавога — зорка трымаць пад кантролем гэты абцягнены калючым дротам шматок зямной плошчы, «ваенны аб'ект», як гаворыць старшына Прахарэнка.

Вечар выдаўся халодны, маразяны, такой абяцала быць і ноч. Прыкметна пазелянела неба, прыбавіў мароз. Чуваць было, як ад марозу трашчалі раз-пораз дрэвы. Платонаў адчуў, як анямела правая рука, якой ён прытрымліваў аўтамат. Перакінуў зброю на левы бок. Аўтаматы — старыя, ППШ, важкія, хаця ў магазіне пазвоньвалі ўсяго толькі тры патроны. Незаўважна гусцелі цені і быццам крадком прабіралася ноч. Слаба бялелі слупы драцяной агароджы, за якой цягнуўся белы аснежаны папар.

Ён зірнуў на неба, без цяжкасцей знайшоў Вялікую Мядзведзіцу. Магутнае сузор'е! Вакол яго чапліліся больш далёкія і, магчыма, больш дробныя зоркі. Зрэшты, гэта залежыць ад адлегласці, ад таго, як далёка яны знаходзяцца. Магчыма, яны самыя буйныя. Ноччу, стоячы на варце, можна ўбачыць, як па небе сярод зорак ляціць спадарожнік. Куды ён ляціць? Куды спяшаецца? Няйначай як у будучыню, у новае стагоддзе. Але ці даляціць, ці не згарыць, набліжаючыся да зямлі. Платонаў для бадзёрасці засвістаў оперны матыў «Тарэадор, смялей!..» Нібы ў адказ азваўся вецер, нешта іграў на калючым дроце. На адкрытай мясцовасці ён узмацніўся. Валодзя прыслухаўся да яго музыкі.

Гэта была складаная, драматычная музыка, якую тварыла сама прырода, і яна была па-свойму прыгожая, ласкавыя, мяккія ноты межавалі з нечакана раз'юшанымі, жорсткімі.

Па небным купале нерухома плыў крутарогі месяц. Валодзя паглядзеў на яго і пасміхнуўся, успомніўшы, як бабуля Фёкла калісьці, даўно гэта было, перасцерагала яго, каб ніколі не рабіў пад месяцам чагосьці непрыстойнага і не паказваў на месяц пальцам. Успомніў і яшчэ раз пасміхнуўся.

— Часавой! Часавой! — пачулася з-за дроту. — Салдацік! Любезнічак мой!

«Паблюзнілася ці што?» — узнікла думка, але не, не паблюзнілася: жанчына, на ёй быў вышыты ўзорамі ці размаляваны яркімі фарбамі фацэтны кажушок. У начным мроіве ён разгледзеў яе гарэзлівыя вочы, прысыпаную снегам шапачку, пасмачку цёмных валасоў, бровы і доўгія вейкі. Погляд яе казаў: падабаешся ты мне і нічога з сабой зрабіць не магу.

«Вельмі ж ты нейкая экзальтаваная, як не ў сабе», — здзівіўся Платонаў, і чамусьці падумалася, што гэта Валя. Ядраны, моцны мароз перацінаў дыханне. «Няўжо прыехала? Ажно з Брэста! Але не, гэта не яна». І не здань, не прывід.

— Я тады цябе ў клубе нагледзела. Харошы ты, — зноў пачулася з-за дроту. — Спадабаўся ты мне. Як такога не любіць? Згаладнеў, пэўна, расслабся!

— Ідзі сваёй дарогай! — рэзка, як каманду, прамовіў ён, адчуўшы не то ў галаве, не то яшчэ дзе абуджаны гул стрэсу. — Я на пасту!

— Дык мы адны-адныя, нікога няма, усе ўжо спяць. Чуеш, як пахне снег?

Паху снегу ён папраўдзе не пачуў, але пачуў, нават на марозе, знаёмы пах парфумы. Прыпомніў: «Адэская акацыя»! «Гэта ж Лана!» — здагадаўся нарэшце і, нічога не цямячы, падняў дрот, дапамог ёй пералезці. Ад яе наплывалі хвалі пахатлівага цяпла, яна дыхала чымсьці мірным, пабытавым, невайсковым, што знаходзілася па той бок калючага дроту, яна ахутала яго сваім водарам.

— Здымай свой кажух, кладзі проста на снег!

— Проста на снег?

— А што? — Яе твар і ўся яна былі ахоплены жарсцевым азартам. — Я гарачая, сагрэю. Вось убачыш! — Яе бессаромныя вочы пад заінелымі вейкамі гарэлі няўтоленым жаданнем. — Табе халадно? — Яна расшпіліла свой расшыты ўзорамі кажушок, расхінула полы яго вопраткі і прытулілася. Ён адчуў, як пад сукенкай напружыліся, завастрыліся яе смочкі і як у самога напружвае жылы сагрэтая жаданнем кроў.

— Памацай, памацай! — не то прапаноўвала, не то прасіла яна. — Паглядзі, які ў мяне прыгожы жывот! — шаптала яму на вуха. — Кушмак пакратай, толькі не абы як, а пяшчотна, дбала...

— А што гэта?

— Лабок! Ты, я бачу, простых рэчаў не ведаеш! — сказала яна з дакорам. — Малады.

Ён прамаўчаў.

— Да мяне адзін паджылы прыставаў, дык я кажу яму: «Стары ты пень, а ў мяне ўсяго адна маршчына, ды і то яе не відаць, бо я на ёй сяджу».

Дакрануўшыся да яе, ён адчуў, што яна дрыжыць, ледзь не калоціцца.

— Думаеш, мне халадно? Не, гэта я ад кахання.

Усё гэта выглядала як смешны анекдот, але Платонаву было не да смеху.

— Пагладзь ягадзіцы, ягадзіцы пагладзь! — Здавалася, яна гатовая была на ўсё дзеля сваіх жарсцяў і хаценняў. У цьмяных вачах з'явіліся дзве зыркія жарынкі. У яе жаноцкасці было нешта жывёльнае, прыроднае.

— Я вартавы, я салдат!

— Бачу, што не конь.

— Нецярплівая ты. Няўжо табе не халадно? Такі дубар, а ты вунь чаго хочаш! Адмарозіш...

— Пра што ты кажаш! Я гарачая! А ў цябе кажух, вось бы на ім пакачацца! Спакусіў ты мяне, салдацік, прычараваў! — без перастанку цвердзіла Лана. — Ты ўжо мне прабач...

— Гэта ў табе палавыя гармоны граюць, — сказаў ён, успомніўшы, што пра палавыя гармоны нагадала ў сваім пісьме Валя.

— Ну і што? Хай граюць...

Яе смочкі навобмацак нагадвалі маленькія рожкі. На адной цыцачцы, ён заўважыў, смочка была напалову адарваная.

— Як гэта здарылася? — пацікавіўся ён.

— А ўжо не памятаю. — Яна засмяялася. — Згубіла.

— Ці хто, можа, адкусіў?

— Як ты мог такое падумаць?

— Я пажартаваў, прабач. Ты замужам?

— З мужам мы незалежныя.

— Як так?

— А так! Ні я ад яго не залежу, ні ён ад мяне. Чужыя, не кладземся разам. — Яна засмяялася. — А ты жанаты?

— Не.

— Дык што цябе стрымлівае? — У яе вачах з'явіўся ашалелы бляск, што сведчыў аб прагнасці жадання. — Вунь месяц за хмары заходзіць, цёмна, давай! Я така тэндэнтна[1], не пашкадуеш!

«Дык што? Лаві мамент?» — пранеслася ў галаве.

— Ой, разамлела я, уся разамлела...

— У мяне ёсць дзяўчына, я абяцаў...

— Мала што паабяцаў, адно другому не пярэчыць.

Ён адчуў у сабе, у нізе, гул семені і нейкі непадкантрольны шал у галаве, але кантраляваў сябе.

— Халадно! — тулячы ў каўнер шыю, зноў паскардзіўся ён.

— Паглядзі — цыцкі якія! Паглядзі, прыдурак! Лашчыць жанчыну не ўмееш, — цвердзіла яна. — Дурань! Прыроду ж не адменіш.

Чамусьці раптам ён востра адчуў сорам — і свой, і стала сорамна за яе. Вырашыў пастрашыць:

— Зараз Мардас з'явіцца!

— Хто гэта?

— Начальнік мой.

— Падумаеш начальнік! Ды я яго ведаю. Недаростак такі...

— Лана, прызнаюся табе, у мяне ёсць дзяўчына, — сказаў ён зноў, але больш не для Ланы, а для сябе.

Гэта яе раззлавала, і яна сябе не стрымлівала:

— Слабак! Вахлак! Лапух! — выдавала яна. — Балдавешка ты! Рохля! — З яе грудзей вырваўся ўздых.

— Дура набітая!

— Ну і тупы! Каму я хацела аддаць любоў?! Хіляк!.. Як я не бачыла? Гэта ж і без бінокля відаць.

З гэтымі словамі яна захінула і зашпіліла полы свайго кажушка, нагнулася пад дротам, ён дапамог. Пералезла і пайшла, растала ў цемнаце ночы.

---

[1] Пяшчотная (*укр.*).

А ён пайшоў сваёй сцежкай, наракаючы на сябе: «Гэта таму, што не адпісаў Валі, цягнуў з адказам на яе такое прачулае, эмацыянальнае пісьмо. Яна ўжо, можа, і крыўдзіцца. Жанчыны адчуваюць...»

Змяніў яго Лбоў. Платонаў стомлена скінуў з плячэй і перадаў яму важкі кажух, адчапіў ад паяснога рамяня армейскі нож і таксама перадаў новаму вартавому. Пасля гэтага пайшоў адпачываць, аднак не пакідалі думкі пра тое, што адбылося. Непрыемны, прыкры выпадак, але, па сутнасці, ён невінаваты: яна сама прыйшла, з’явілася з начной цемені.

Нейкі асадак усё ж застаўся.

Адбыўшы варту, вярнуўся ў казарму, можна было крыху адпачыць. Зірнуў на ложак Ваўрычына. Толя спаў, раскінуўшы рукі і задраўшы галаву, спаў моцным сном чалавека, у якога ўсё ў жыцці складвалася так, як трэба. «І ў мяне павінна ўсё наладзіцца», — падумаў Платонаў і стаў распранацца і ўкладвацца на свой ложак.

Аб нечым спрачаліся ездавы Ганіеў з матарыстам Алавердзянам. Не далей, як учора, была «агнявая падрыхтоўка»: на палігоне стралялі па мішэнях, старшына аджалеў па тры патроны. Страляў і Ганіеў: адзін за адным тры высверкі з ППШ, але ні разу не трапіў. «Мазіла!» — сказаў пра яго Алавердзян.

— Радавы Ганіеў, ты салдат ці не салдат? — дакараў Тула.

— Салдат.

— Чаму ж у мішэнь не папаў?

— ППШ спрашывай, ён страляў.

Навокал зарагаталі, смяяўся і сам «снайпер». Служба давалася Ганіеву нялёгка, можа, нават цяжэй, чым каму, але аптымізму чалавек не траціў. Што ні скажаш — ён рагоча.

— Узбекі майстры смяяцца, — тлумачыў ён. — Узбекістан увесь смяецца.

— Так ужо і ўвесь? — сумняваўся калега, усё той жа Тула.

— Увесь, дарагой.

Сустрэўшы Платонава, Ганіеў пытаўся:

— Ці скончыцца калі гэты зіма?

— Скончыцца, дарагой, скончыцца.

— Эх, Валодзя, плахой твой Расія. Мароз! Узбекістан — цёпла! У нас кажуць, што адной ладошкай у ладкі не ўдарыш. Аднаму сумна, язык знай плоха, няма з кім гаварыць. Думай свой дэвушка. Очэнь красывый, кожа белый, а на шчацэ родынка, дык ліцо яшчэ бялей здаецца. — Тут Ганіеў ажно прыцмокнуў. — Пісьмо палучал, сястра пісал, дэвушка любімый ажыдает!..

— Ажыдает! — падтрымаў Платонаў. — Пісьмы пішы!

Вечарам Платонаў, не адкладваючы на потым, адпісаў Валі:

«Дарагая Валюша!

Дзякуй за пісьмо, я перачытаў яго дзесяць разоў, не меней, настолькі міла яно напісана. Дзякуй за ўсё. Калі ты гаворыш пра каханне, ты чытаеш у маім сэрцы, я цябе таксама кахаю, кахаю ўсё больш і больш. У мяне ўсё добра, усё ў парадку. Дзякуй табе за парады. Наконт падушак. Падушкі ў нас ва ўсіх аднолькавыя, наш старшына Прахарэнка напхаў іх сенам. Я сплю на правым баку, як прывучылі ў вучэбнай роце. Ты пішаш пра калені. Не, калені ў мяне не баляць, ці, можа, я не адчуваю болю за каханнем да цябе. Прабач за гэты мой няскладны жарт, але гэта праўда, я кахаю цябе вельмі моцна.

Цяпер на дварэ марозная зіма. Пра вясну кажуць, што гэта такая пара года, якая нікога не можа пакінуць абыякавым. А восень, лета, зіма? Хіба яны не цудоўныя? Зіма бадзёрыць і загартоўвае. У нас тут навaліла снегу, чысцім

дарожкі, шчыпле за шчокі мароз. Галоўнае, каб быць у руху, тады не страшны і холад. Прырода — твой сябар, калі ўмееш з ёю дружыць.

Часта ты мне снішся. Сны, сама ведаеш, бываюць розныя. Часам снішся і ты. Аднойчы ў сне ты мне прапанавала: «Давай усур’ёз пагаворым пра шчасце. Для шчасця трэба шмат». А я кажу: «Шчасце — гэта каханне дваіх. Ты ў маёй душы — і гэта шчасце, а дзве палавінкі ў адным — вялікае шчасце». Жанчына, канечне, мае вялікую сілу. Японцы кажуць: жанчына захоча, дык праз скалу пройдзе. Разам з тым вядома, што жанчына — істота непрадказальная. Гэтага і я баюся. Але годзе філасофстваваць.

Адчуваю сталасць, у мяне пачала завівацца барада, галюся ледзь не кожнай раніцы.

Тваё пісьмо, прызнацца, выклікала ў мяне як бы нават зайздрасць: ты на свабодзе, а я фактычна ў няволі, адзінокі, неабласканы, неабагрэты. Але я ў душы аптыміст, жыву згодна з вядомай прымаўкай: «Упярод, і з песнямі!» Адслужу і вярнуся...»

У гэтым месцы ён спыніўся, успомніў начное здарэнне, Лану і напісаў:

«...Чалавек да ўсяго даходзіць толькі праз асабісты досвед. Я раўнівы, часам уяўляю, як ты на танцпляцоўцы танцуеш з кімсьці іншым. Ці сапраўды ты кахаеш мяне? На памяць прыходзяць радкі Мікалая Асеева пра нялёгкае жыццё сучаснай жанчыны:

И часто за тебя мне боязно,
что кто-нибудь ещё и кроме
такую тонкую у пояса
тебя возьмет и переломит.

Было неяк, што прычапілася дэпрэсія, у такіх выпадках я мыю сваю армейскую форму — і настрой паляпшаецца. Не перастаю, аднак, думаць пра цябе. Каму ты цяпер дорыш сваю прыгажосць? Калі кінеш мяне, дык я, як камень, пайду на дно. Але, думаю, гэтага не здарыцца. Чакаю таго моманту, калі ты будзеш у мяне на спатканні, і я пачую стук тваіх абцасікаў. І ты з’явішся ў самай прыгожай сваёй сукенцы.

Шлю табе моцнае армейскае прывітанне. Прывітанне тваёй маме Людміле Пампееўне. У цябе цудоўная мама.

Моцна і пяшчотна цябе абдымаю, цалую шмат-шмат разоў.

Твой Валодзя».

Адправіўшы пісьмо, падумаў, што, можа, залішне катэгарычна ці нават недалікатна выклаў некаторыя думкі. Пашкадаваў, але ўжо адправіў. Зірнуўшы ў акно, убачыў, як нязграбна ступае па снезе і правальваецца варона. Падумаў, што нялёгка ўсім, і вароне таксама.

Яшчэ адна падзея ў маштабе ротнага жыцця: яфрэйтару Анатолю Ваўрычыну прысвоена званне малодшага сяржанта. Толя ўзяў у каптэнармуса Тулы кавалак чырвонай тканіны, якая ішла якраз на такія патрэбы, выкраіў дзве тонкія лычкі — па адной на кожны пагон — і прышыў у дадатак да яфрэйтарскіх. Пабольшала «зарплата»: жалаванне шараговага салдаціка — тры рублі ў месяц. У яфрэйтара на адзін рубель болей, у малодшага сяржанта яшчэ на рубель — пяць рублёў. З прысваеннем звання павіншаваў Русяеў:

— Пасля дэмбеля заменіш мяне.

Павіншавалі іншыя, у тым ліку Платонаў.

— Начальства аказала давер, — пасміхнуўся свежаспечаны малодшы сяржант. Устаў, атузаў гімнасцёрку, паправіў паясны рэмень і зноў сеў.

— Цяпер ты, Толя, напэўна, заганарышся?

— Не ў маіх правілах.

— Тады маё пажаданне — не спыняцца на дасягнутым, — працягваў віншаваць Платонаў. — Каб дзве тонкія лычкі ператварыліся ў адну тоўстую.

— А ведаеш, як загнаць хахла ў бутэльку? — засмяяўся Толя.

— Як?

— Пакласці на дно бутэлькі лычку.

Яны засмяяліся разам з дасціпнага жарту.

— Я, Валодзя, да гэтага не імкнуся.

— Я ведаю, ты і без лычак чалавек самавіты.

— Што значыць самавіты?

— Ну, сапраўдны, ты, скажам, выдатны аператар, цэляў можаш весці столькі, колькі іх на экране.

— Люблю працаваць з душой, украінцы — людзі працавітыя, гультаёў не церпяць. Духоўная паражнеча — кажуць пра такіх.

— Дык і беларусы працавітыя. Праўда, ёсць у іх спецыфічныя рысы. Адзін філосаф сказаў пра беларусаў, што гэта людзі ціхія і неверагодна цярплівыя.

— Украінцы таксама цярплівыя, галадамор перажылі. Мы з табой былі на абмеркаванні рамана «Голад», сам Васіль Кучар прысутнічаў. Я хацеў тады выступіць і сказаць, але ўстрымаўся. Украінцам да голаду не прывыкаць. У трыццаць трэцім годзе, мне бацькі расказвалі, такі голад быў, што пчолаў з вулляў даставалі і елі. А ўвогуле я табе скажу: украінцы любяць свабоду.

— У жыцці самае галоўнае — свабода, — згадзіўся суразмоўца. — Свабода і здароўе.

— Відаць, так яно і ёсць, — падтрымаў сябра Ваўрычын.

Прыязнасць шарагоўца-беларуса і малодшага сяржанта ўкраінца трывала далей.

Да Платонава не пераставалі прыходзіць пісьмы. Абудзіла ўспаміны нечаканае пісьмо ад другога аднакурсніка — Сёмы Кольберга. Платонаў вельмі ўзрадаваўся. Пазнаёміліся яны на першым курсе педінстытута, а зблізіліся, калі іх паслалі ў калгас капаць бульбу. Паехала ўся група. Народ у асноўным правінцыйны, свойскі, засцянковы, як кажуць. Былі і гараджане, берасцейцы, — з сем'яў мяшчанаў, служачых, вайскоўцаў, яўрэяў. Разам працавалі, а на ад'езд наладзілі канцэрт для вяскоўцаў. Кожны хацеў пахваліцца сваім уменнем і адметнасцю. Сёма асмеліўся і спяваў «Застольную» Бетховена, свайго любімага кампазітара: «Налей, выпьем, ей-богу, ещё!..» Меў поспех, сарваў апладысменты, яму доўга пляскалі ў далоні расчуленыя сяльчане. Пляскаў і Платонаў. У параўнанні з ім, недасведчаным вяскоўцам, Сёма выглядаў эрудытам. Шмат ведаў і ўсім цікавіўся — літаратурай, музыкай, жывапісам, старажытнымі мовамі, операй і балетам. Вядома, у Брэсце не было ні оперы, ні балета, дык ён сачыў за часопісамі і газетамі, у якіх змяшчаліся артыкулы і рэцэнзіі на новыя оперныя і балетныя спектаклі. Рана абрынулася на яго каханне. Зазнобай яго стала Мальвіна Салодкая, якая вучылася з ім у адной групе. Прыгожая была, гэтага ў ёй было не адняць. Шыкоўныя локаны звісалі з галавы і дасягалі плячэй. Вусны сакавітыя, нібы даспелыя чарэшні. Сёма вельмі няроўна на яе дыхаў, а Мальвіна заставалася абыякавай, не заўважала Сёмавых чорных міндалепадобных вачэй, жартавала:

— Сёма, у тваім прозвішчы згубілася вельмі важная літара — «дэ». Было — Гольдберг, гэта значыць «залатая гара», а стала Кольберг — «гара капусты». Скажы, як гэта магло здарыцца? Гара нейкай капусты! Відаць, продкі былі няўважлівыя да свайго прозвішча гэтак, як ты няўважлівы да мяне. — Мальвіна хіхікнула, а потым зарагатала ўголас. Сёма цярпеў дзявочыя здзекі, але надзеі не губляў. Больш за тое, ён нават пахваліў Мальвіну, сказаў, што яна сапраўдны філолаг, калі так умее прааналізаваць.

## Алесь Марціновіч

# «ЭКСПРЭС», ШТО ІМЧАЎ НАПЕРАД



Алесь Дудар, Валеры Маракоў і Мікола Нікановіч, 1932 г.

Біяграфія Міколы Нікановіча шмат у чым падобная да жыццяпісаў многіх беларускіх творцаў, якія працавалі ў літаратуры ў 20-х — пачатку 30-х гадоў. Хіба што пра яго вядома крыху менш, чым пра іншых. А ён заслугоўвае таго, каб пра яго памяталі. І дзякуючы напісанаму ім, а яшчэ і таму, што ідэалы, якія ён прапаведаваў у сваіх апавяданнях, аповесцях, раманах — гэта была не дэкларацыя высокіх ідэалаў станоўчых літаратурных герояў, а перакананасць і адданасць савецкай уладзе самога аўтара. Дарэчы, абараняць Радзіму ён пачаў яшчэ ў час партызанскай барацьбы ў Грамадзянскую вайну, калі на краіну напалі польскія акупанты. Тады яму было толькі васямнаццаць гадоў.

Нарадзіўся Мікола Нікановіч 15 красавіка 1902 года ў вёсцы Кляннік. Тады гэта быў Ігуменскі павет, цяпер Смалявіцкі раён. Маленства яго было і бядотнае, і нярадаснае. Калі яму споўнілася восем гадоў, памёр бацька. Тым не менш, ён усё ж змог вучыцца. Скончыў пачатковую школу ў роднай вёсцы, затым вучыўся ў гімназіі ў Ігумене, сённяшнім горадзе Чэрвені. Калі пачалася акупацыя Беларусі белапалякамі, не задумваючыся, уліўся ў шэрагі байцоў, якія давалі адпор захопнікам. Шмат чаго з перажытага пазней увойдзе ў некаторыя яго празаічныя творы. А пакуль што было не да іх. У гэты час ён напісаў толькі некалькі вершаў. Адзін з іх, «Вясковы камсамол», надрукаваў у 1925 годзе ў часопісе «Аршанскі маладняк».

З першымі допісамі і нататкамі Мікола Нікановіч выступіў у газеце «Савецкая Беларусь» у 1923 годзе. Ужо па назвах асобных з іх відаць, што яны адпавядаюць свайму неспакойнаму часу, калі рэвалюцыйна настроеная моладзь, а да яе, вядома, належаў і ён, рашуча выступала супраць тых заган жыцця, якія, як былі тады ўпэўнены, з'яўляюцца перажыткамі мінулага. Пра тое кажуць такія яго

матэрыялы, як «Самагон і табака», «Забабоны на вёсцы», апавяданне «Ахвяра цемнаты». У першым з іх асуджаецца схільнасць да кепскіх звычак. У наступным годзе ў газеце «Беларуская вёска» з'явіўся матэрыял «Ці патрэбен пост?.. Думкі й развагі ў вялікі пост». Выступаючы ў «СБ», Мікола Нікановіч прывёў шмат выпадкаў, сведкам якіх сам быў неаднойчы: «За прыкладамі хадзіць доўга не трэба: кожная вёска дае іх вельмі багата. <…> усе вечарынкі на вёсках, вяселлі, хрэсьбіны, халтуры неадступна суправаджаюцца самагонам, якога напіваюцца да смерці. П'юць усе: старыя і маладыя, мужчыны і кабеты, а потым сварка і бойка на кулакі, калы і каменні. Дурман самагону круціць галаву, і той, хто лічыўся ціхім, добрым і характарным хлопцам, рабіўся напіўшыся настаяшчым разбойнікам».

Допіс «Забабоны на вёсцы» зацікаўлівае, калі знаёмішся з яго падзагалоўкам — «Дзяды». Гэтым разам аўтар выступае супраць старажытнага звычаю. Аднак дзіўна тое, што ў пачатку, у вялікім абзацы, які па плошчы займае амаль палову матэрыялу, аўтар, па сутнасці, Дзяды прапагандуе. Так падрабязна апавядае пра іх, што гэта выклікае цікавасць нават у тых, хто пра іх мала ведаў. У чым прычына — сказаць няпроста. У сувязі з гэтым выкажу два меркаванні. Першае звязана з тым, што пісьменнік з маленства добра ведаў, як шануюць памяць пра памерлых, у тым ліку і пра яго бацьку. Гэта, несумненна, запала яму ў памяць, зрабіла на яго адпаведны ўплыў. Другая прычына звязана з першай. Расказам пра Дзяды ён так захапіўся, што не заўважыў, як выклікаў павагу да іх. Атрымалася, што ў аповедзе адбыўся як бы «збой». Другая частка нататак, у якой Дзяды асуджаюцца, атрымалася занадта рытарычнай:

«Моладзь вёскі, за вамі не толькі слова, а і дзела! Трэба вечары (маецца на ўвазе святкаванне Дзядоў. — *А. М.*) выкарыстоўваць у антырэлігійных лекцыях, у добрых пастаноўках спектакляў, літаратурных вечароў і інш. Не трэба даць магчымасці маладым і нежным душам прыняць дурное зелле рэлігійнага забабону на свае нежныя і пышныя глебы — сэрцы. Няхай над нашым маладым пакаленнем вечна свеціць сонца Свабоды, няхай навука будзе іх стравай духоўнай і тым зернем, што багата закрасуе-зацвіце ў душы кожнага дзіцяці прыгожым макацветам.

Моладзь, зрабі, што ад цябе залежыць, і забабон на вёсцы згіне».

А вось абразок «1-ае Мая» напісаны так, што ўрачыстасць, якая панавала ў гэты святочны дзень, перададзена настолькі пераканаўча, што нібы пераносішся ў той час. На вуліцы вёскі выйшлі ўсе яе жыхары. Сярод іх быў і дзядуля: «Шчыльным абручом абступілі яго, штандары абкрылі яго галаву, грыміць музыка…». Моладзь унесла яго на трыбуну, папрасіла сказаць слова. І яно загучала: «— Браточкі... Мне шчасце сягоння прыйшло… Мой унук — бальшавік… Гэта добра, бо што было б, каб аж дагэтуль былі палякі… старыя паны… Ох, шмат мы вынеслі ад іх… Я сам бальшавік!..»

Пафасна? Не без гэтага, але ў той жа час і праўдзіва. Мікола Нікановіч свядома не назваў ні прозвішча, ні імя гэтага дзядулі. Не сказаў колькі слоў і пра тое, хто ён такі. Бо гэта, няцяжка здагадацца, вобраз збіральны. Што былі тыя, хто новую ўладу не ўспрымаў, не сакрэт. Аднак не сакрэт, што нямала было і іншых дзядуляў, якія віталі змены. Гэты дзядуля, калі б ведаў верш Міколы Нікановіча «Вясковы камсамол», ахвотна прадэкламаваў бы яго, уяўляючы сябе на месцы юнакоў і дзяўчат, якія з запалам адмаўлялі старое жыццё:

То не гром, не віхура бушуе,
Раскудлячвае косы зарніцы —
Гэта моладзь старое руйнуе,
Выганяе і з вёскі начніцу.

Не менш бы ўразілі яго і наступныя радкі:

Захліпнецца ў віры жыццёвым
Ўсё пайшоўшае прахам учора,
Ноч загіне пад сонцам чырвоным,
Пад праменнем у золаце з зораў.

Мікола Нікановіч быў настаўнікам, пасля – загадчыкам Клянніцкай школы. Яго зборнікі «Радасць» і «Золак» выйшлі адначасова ў 1926 годзе. Праз два гады з'явіўся трэці — «Крык працы». Выхад яго супаў з пераездам Міколы Нікановіча ў Мінск. Там ён пачаў працаваць стылістам ў рэдакцыі газеты «Чырвоная змена», потым — у газеце «Звязда». Увайшоў у літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», потым — у Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў.

Належаў да творча актыўных пісьменнікаў. Акрамя згаданых кніг яму належыць зборнік апавяданняў «Вясновы прамень» (1929), асобныя выданні аповесцей «Мяцеліца» (1930) і «У паўстанцаў» (1931). Друкаваўся ў часопісах «Маладняк», «Малады араты», «Полымя», «Чырвоная Беларусь», «Беларусь калгасная», «Беларускі піянер», у газеце «Чырвоная змена», іншых выданнях. Займаўся і перакладчыцкай дзейнасцю.

У пачатку творчага шляху і пазней звяртаўся да газетна-часопісных жанраў. Гэта былі ўжо не матэрыялы, якія неслі ў сабе толькі пэўную інфармацыю, зместам прывязаную да патрэб дня, як тыя «Забабоны на вёсцы», «1-га Мая», «Патрэбны кнігі» і іншыя, да іх падобныя. Пісаў і такія, у якіх надзённыя праблемы не толькі ўзнімаліся, але і падаваліся ў іх асэнсаванні, з указаннем захадаў па ліквідацыі недахопаў. Часам адбывалася і як бы «размыванне» жанру, калі нарыс ператвараўся ў дакументальнае апавяданне. А вось аповесць «У паўстанцаў», хоць гэта і не агаворваецца, па жанры — дакументальна-мастацкая. Што гэта так, нагадвае і падзагаловак «Жывыя кавалкі з жыцця жывых людзей». На карысць гэтага сведчыць пачатак твора, у якім Мікола Уладзіміравіч апавядае, як узнікла задума яго напісання:

«28 студзеня 30 года. Мінск

Гэта было не сёння і не ўчора. Гэта было дзесяць дзён таму назад.

Пятнаццаць чалавек белаппаўцаў вылучана праўленнем БелАППа і Белкалгассаюзам для паездкі ў калгасы — з мэтай азнаямлення і апісання ў мастацкіх нарысах... — так, між іншым, значылася ў кожнага з нас у пасведчанні.

Я еду ў Слуцкі раён. Акрамя наяўнасці нараджэння новых, яшчэ зялёных калгасаў, там цяпер, як і ўсюды, па ўсёй Беларусі жорсткая класавая барацьба. Так, барацьба! Бо я ніколі не магу ўявіць і не ўяўляю, каб загнаны воўк на аблаве спакойна, як ягнё, аддаў сябе ў рукі паляўнічых.

Мне цікава ўбачыць ўсё гэта сваімі вачыма».

Такая паездка, прымаючы пад увагу мастакоўскія задаткі Міколы Нікановіча, давала падставы нарадзіцца не проста аповесці, як ён вызначыў жанр, а падарожнаму нарысу. Не такому, як у пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Ядвігіна Ш., Янкі Купалы, Цёткі, Максіма Багдановіча, Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, у аснову якіх ляглі ўражанні ад паездак у няблізкія дарогі, а нарысу,

пабудаванаму на мясцовым матэрыяле, над якім у 20—30-я гады плённа працавалі многія старэйшыя і маладзейшыя пісьменнікі. Яны, як і Мікола Нікановіч, ахвотна ездзілі па Беларусі. Наведвалі і прамысловыя прадпрыемствы, але часцей бывалі ў вёсцы, дзе ствараліся калгасы.

Яго камандзіроўка, калі мець на ўвазе толькі галоўную мэту, пастаўленую перад ім — напісанне твораў пра абнаўленне вёскі, пра пераход ад індывідуальнага гаспадарання да калектыўнага, адпавядала паездкам іншых пісьменнікаў па Беларусі. Ён жа падышоў да ажыццяўлення пастаўленых задач па-свойму. Не задаволіўся паказам няпростых працэсаў на сяле, але і ўважліва прыглядзеўся, як новае жыццё, новыя сацыяльныя адносіны авалодваюць душамі людзей.

Гэтыя змены, зразумела, тычыліся і горада. Таму, перш чым завітаць у адзін з калгасаў, што стала асноўнай мэтай наведвання, ён зазірнуў і ў слуцкую кнігарню. Захацеў даведацца, якія творы беларускіх аўтараў ёсць у ёй. Як распаўсюджваецца нацыянальная літаратура, таксама пацікавіўся і ў райкаме камсамола. Сама пастаноўка пытання сведчыць аб тым, што ён хацеў яшчэ больш упэўніцца, наколькі літаратура з'яўляецца свайго роду хлебам духоўным, бо дзякуючы і ёй «пайшла цэлая ломка старога быту... Сёння пракладваюць дарогу вялікаму заўтра...» Як гэта адбывалася, распавядаў: «Толькі а пятай гадзіне мы выязджаем у калгас «Селянін» Цароўскага сельсавета. Гэта колішні маёнтак — Навадвор'е. Ад Слуцка ён у адлегласці васьмі кіламетраў. Прыехалі скора». Для таго, каб чытач атрымаў большае ўяўленне, як выглядала сядзіба, не скупіўся на дэталі ў перадачы таго, што ўбачыў: «Ужо зусім было цёмна, калі мы ўз'ехалі на велізарны дзядзінец і ўткнуліся ў белы каменны будынак з аграмаднымі, на ўсю сцяну, вокнамі. Напамінае аранжарэю. За густымі кустарнікамі распаўзаліся аборы, хлявы, свінарнікі. Наводшыбе гараць агні. Свяцяцца лямпы». Гэта тое, што засталося ад былога гаспадара маёнтка. Пра яго будзе сказана пазней. А пакуль следам за прыведзеным урыўкам ідуць адзін за адным два сказы: «Недзе за хлявамі, у глыбокім яры, брэшуць сабакі. Адзін густым басам, другі — цепка. І гэты брэх вельмі ж намінае званы» і «Між чорных звярэй ночы на захадзе зашчаміўся язык зары». Таксама ніякага аўтарскага тлумачэння, што хаваецца за гэтымі вобразамі. Здагадвайся, маўляў, чытач сам. Здагадацца, улічваючы тагачасныя абставіны, нескладана. Параўнанне брэху са званамі, калі задумацца, трапляе пад «інтэрнацыянальны» змест: «Весь мир насилья мы разрушим: // До основанья, а затем // Мы наш, мы новый мир построим — // Кто был ничем, тот станет всем». А ў гэтым новым свеце, мелася на ўвазе, месца рэлігіі не застанецца. А пад «языком зары», несумненна, трэба разумець шчаслівую будучыню, воблік якой прабіваецца нават праз цемень ночы.

Такое вытлумачэнне, праўда, можна палічыць толькі магчымай высновай, якую меў аўтар на ўвазе. Аднак, ведаючы скразныя матывы, што праходзяць праз многія творы Міколы Нікановіча, падобны варыянт адмаўляць нельга. Ён звычайна не хаваў матывіроўкі ўчынкаў сваіх персанажаў, якія падтрымлівалі змены ў жыцці грамадства. Менавіта гэты пасыл уводзіў у свядомасць чытачоў. Рабіць так было няцяжка, бо гэта адпавядала яго светапогляду. А яшчэ, як відаць у аповесці «У паўстанцаў», ішоў ад таго, што сам вытлумачвае як «стыль тыпізацыі». І працягвае: «Я не ведаю, чаму так, але поўныя абставіны і рамкі жыцця і работы выпрацоўваюць адпаведны вопыт чалавека. Я вам заўсёды, без памылкі падкажу з аграмаднай чарады разнапёрых людзей і вясковага і местачковага

настаўніка, фельчара, старшыню сельсавета, сакратара райкама, старшыню РВК… Тып калгасніцы ў нас ёсць, ужо выпрацаваўся».

Як гэты тып выглядае, аўтар прыводзіць такія падрабязнасці, якія сведчаць і аб яго назіральнасці, што бачылася ў творах неаднойчы, і аб уменні пераходзіць да абагульненняў, у кожным выпадку выбіраючы характэрнае, аб чым таксама пераконваў неаднаразова: «У тых калгасах, якія праіснавалі ўжо некалькі гадоў, — жанчына зусім адменна ад вясковай гаспадыні. Выраз твару, вачэй, уся постаць, нават ужо што, а і гаворка (у сэнсе багацця слоў, мовы), і песні — зусім іншыя. І вясковая жанчына на яе глядзіць як на нешта новае, што перароджанае і адначасова зайздроснае». З-за гэтай схільнасці да тыпізацыі, як толькі ўбачыў жонку старшыні калгаса, прыкмеціў, што «яна сухая, з упалымі вачыма, тып беларускай вясковай жанчыны, але яшчэ некалгасніцы» (разбіўка тут і далей М. Н. – *А. М.*). З асуджэннем паставіўся да жанчын, у якіх «асталося такое нешта ад старога. Не змагла яшчэ скінуць з сябе той шалупаіны, у якой маці нарадзіла. Шалупаіна гэта сыдзе сама па сабе. Але гэта адбудзецца толькі тады, калі рэлігія, непісьменнасць, адвечная коснасць, сялянская ідэалогія і верацяно адамруць, знікнуць…»

Пасля гэтых слоў, калі многае і так ужо сказана пра адрознасць жанчыны некалгасніцы ад калгасніцы, аўтар перайшоў не проста да публіцыстычнасці. Публіцыстычнасць атрымалася ваяўнічай, чаго за ім раней не назіралася. Нават цяжка паверыць, што такі вялікі гнеў можа выклікаць адна з прылад працы, якая была ў кожнай вясковай жанчыны. Ды і яшчэ многае, без чаго на сяле не абысціся: «Яна прадае яшчэ на верацяно. Падумайце, які гэта сёння жах: верацяно! Верацяно ў свой час апявалася сотні раз паэтамі і беларускімі, і расійскімі, і ўкраінскімі; аб ім складзена і пяецца, і не толькі па глухіх кутках вёскі, — шмат песень. Аднак я сёння ненавіджу верацяно. Верацяно, каса, серп, цэп, газнічка і лучына… — нашае сёння… ды што там!..»

Усё ж трэба аддаць яму належнае. Хоць верацяно і іншыя прылады спрадвечнай вясковай працы і выклікалі, калі карыстацца яго словамі, жах, ён не належаў да тых, хто хацеў выкінуць іх цалкам, як нешта непатрэбнае. Хоць і пісаў у духу свайго часу, але і з позіркам у будучыню: «Даўно пара закаваць іх у ланцугі — заўтра і ўрачыста паставіць у этнаграфічным аддзеле Мінскага беларускага музея». Дарэчы, увагу музеям надаваў не ўпершыню. У тым жа 1923 годзе, калі дэбютаваў у газеце «Савецкая Беларусь», выступіў з двума нататкамі: «Мінуўшчына й музей. Ўражанні вяскоўца» і «Трэба шанаваць старажытнасці». І раптам такое непрыняцце верацяна! Як гэта ўспрымаць? Спакойна. Гэта таксама была праўда, але праўда чалавека, пісьменніка, які ў сваіх грамадска-палітычных памкненнях мог у нечым і памыляцца, але вітанне новага жыцця — асноўны матыў яго творчасці.

У аповесці «У паўстанцаў» гэта відаць на прыкладзе аднаго з калгасаў Случчыны. Прытрымліваючыся жыццёвай праўды, ён, аднак, не спяшаецца, як кажуць, забягаць далёка наперад. Працэс шляху ад індывідульнага вядзення гаспадаркі да калектыўнага паказаны як складаны, звязаны са зменамі псіхалогіі людзей, якія звykліся са сваёй абяздоленасцю:

«Тут раней, яшчэ да рэвалюцыі, на тым месцы, дзе цяпер калгас «Селянін», — быў маёнтак — Навадвор'е. Арандаваў яго нейкі дробны панок Скроцкі.

СПАДЧЫНА

## Віктар Гардзей

# МАЯ ПАЧАТКОВАЯ ШКОЛА

*Нарыс*

Добра памятаю, як у першыя пасляваенныя гады мы, вясковая дзятва, дужа радаваліся, што ў Малых Кругавічах ёсць свая, няхай і пачатковая, але даволі прыстойная школа. Стаяла яна пасярод слаба вытыркнутага з зямлі пагорка, на скрыжаванні вясковай вуліцы і нешырокага, як праехаць возу, прасёлка, які вёў сюды аднекуль з-пад самых Агарэвіч. Можна толькі меркаваць, што ў даўнія часы школа была ўзведзена па нейкім удалым праекце, бо нават знешне істотна адрознівалася ад прыземістых сялянскіх хат, як правіла, з аброслымі зялёным імхом саламянымі стрэхамі. Наводдаль драўляны школьны будынак здаваўся прамавугольнай формы, але ў сапраўднасці быў падоўжаны ў бок тарцовых сцен. Здаецца, у 1951 годзе гарэў новы дом лесніка Уладзя Падгайскага — менш як за сто метраў ад школы, адразу цераз вуліцу. Набеглі людзі, вёдрамі і ўсякім іншым посудам насілі ваду з суседняй сажалкі, няспынна аблівалі дах, сцены, і школьны будынак ацалеў, не хапіўся агнём ад блізкага пажару. На другі дзень пляц навокал ляжаў аж чорны ад галавешак, сажы, попелу, што пры высокай тэмпературы асыпаліся зверху.

У любы час года наша пачатковая школа вабіла дзяцей сваімі сонечнымі шырокімі вокнамі, на тры сцяны іх было ўрэзана шэсць з падвойнымі рамамі, каб узімку не дзьмулі халады, а ўсярэдзіне памяшканне раздзялялася драўлянай перагародкай з умураванай на абодва бакі груВасткай печкай. Вучэбных класаў было два. На большы клас прыпадала амаль дзве трэці ўсёй карыснай плошчы і адна трэць — на меншы. Колішнія будаўнікі, відаць, не разлічвалі на вялікі кантынгент вучняў у будучым, таму прадугледзелі толькі адны ўваходныя дзверы. Напэўна, тут дзейнічаў тагачасны прынцып беднякоў: менш дзвярэй і вокнаў — больш сэканоміцца цяпла. Напачатку школьны будынак не меў хоць якога маленькага калідорчыка або сенцаў. У памяшканне заходзілі проста з двара.

У 1953 годзе я і мае блізкія сябры Стась Ражыцкі, Коля Гардзей былі запісаны ў першы клас, дык наша настаўніца Наталля Сямёнаўна Данілава нават на перапынках сядзела разам з дзецьмі, бо выйсці не было куды. У суседнім класе гэтак жа курчыўся і замярзаў сам дырэктар школы Мікалай Адамавіч Кішко. Родам з вёскі Драбаўшчына Клецкага раёна, пасля вайны ён асталяваўся на жыццё ў нашай вёсцы. Персанальна клас не вёў, але заўсёды падмяняў настаўнікаў з выпадку хваробы ці якой-небудзь іншай прычыны. Іменна ён, Мікалай Адамавіч, ужо на другое лета пачаў выпраўляць сітуацыю, якая склалася вакол Малакруговіцкай пачатковай школы.

Нават у цяжкія пасляваенныя гады мясцовыя ўлады, як маглі, стараліся забяспечыць свае школы грашовымі сродкамі, інвентаром, будаўнічымі матэрыяламі. На той жа час у суседніх вёсках, Кукоў і Вялікія Кругавічы, пачалі дзейнічаць калгасныя піларамы, так што праблемы з набыццём дошак, дыляў, брусоў не было. На школьны пляц прыйшлі лепшыя вясковыя цесляры, і ўсяго за месяц-два яны правялі рамонт і рэканструкцыю школы, ухілілі недаробкі,

што перашкаджалі дзецям вучыцца. Так, да глухой сцяны памяшкання майстры прыбудавалі высокі і прасторны калідор, нават з акенцам каля ўвахода. З калідора ў абодва класы цяпер вялі свае асобныя дзверы. А колькі патрэбных дзецям рэчаў размясцілася ў новай прыбудоўцы! З краю тут стаяў бачок з пітной вадой, без якога раней неяк абыходзіліся, з'явілася агульная вешалка для адзення, бліжэй да цэнтра абсталявалі кладоўку для рабочых інструментаў — вёдзер, грабляў, сякога-такога спартыўнага інвентару. Дзіўна, але ў канцы калідора знайшлося нават месца для невялікай, цеснай, як матроскі кубрык, настаўніцкай. На заканчэнне ўсіх работ будаўнікі паквэкалі калідор зялёнай фарбай, накрылі дах шыферам.

Калі пачаўся новы навучальны год, настаўніцы пачатковых класаў Н. С. Данілава, М. П. Кошалева, Г. Е. Церашкова, ды і сам дырэктар М. А. Кішко ўжо не ціснуліся да гарачай грубкі, а на перапынках з гонарам беглі ў свой цесны «кубрык», дзе ў іх была магчымасць адпачыць, зрабіць нейкія дробныя справы, выпіць духмянага чаю. З войска акурат вярнуўся настаўнік, наш аднавясковец, Мікалай Сцяпанавіч Лойка, і першы год працаваў у пачатковай школе, пакуль яго не ўзялі гісторыкам у Кругавіцкую дзесяцігодку. Да слова сказаць, у першыя пасляваенныя часы ў Ганцавічах дзейнічала педагагічнае вучылішча, і таму пытанняў з кадрамі ў навакольных школах, здаецца, не было.

Пасля рамонту і ўдалай рэканструкцыі школьнага будынка да нас таксама ці не ўпершыню прыслалі студэнтак-практыкантак, і яны, бадай, цэлы месяц не так навучалі дзяцей, як побач з вопытнымі педагогамі вучыліся працаваць самі. У першым класе з прыезджай дзяўчынай мы паспяхова развучылі вясёлую песеньку пра белага і шэрага гусей, і з тым наша практыкантка з'ехала на сваю педагагічную вучобу. Але не абышлося без дробнага канфузу. Дзяўчына кватаравала ў хаце маёй суседкі Зосі, дык яе сынок Коля Заяц, гады на тры старэйшы за мяне, нейкім чынам залез у неасцярожна пакінуты навідавоку журнал першага класа і па-свойму ацаніў яшчэ кволенькія веды першачкоў: панастаўляў каму двоек, каму — пяцёрак. Калі скандал адкрыўся, наша Наталля Сямёнаўна доўга не магла высветліць, дзе ў журнале сапраўдная ацэнка, а дзе фальшывая.

Прыкладна ў тыя ж гады Малакругавіцкая пачатковая школа стала цэнтрам грамадскага жыцця ў нашай вёсцы. Тут, у вялікім класе, рэгулярна праводзіліся брыгадныя і справаздачныя калгасныя сходы, выступалі заезджыя самадзейныя артысты, чыталі лекцыі і даклады агітатары, прапагандысты. Дзецям не забаранялася ўплішчыцца сярод дарослых, сядзець ціха і слухаць, што там дзеецца на белым свеце. Але найбольш нашу школу ўпадабалі ганцавіцкія кіншчыкі. Калі раней кінаперасоўка прыязджала гады ў рады, то цяпер наведвалася рэгулярна, раз, а то і два на тыдзень. Шырокі калідор дазваляў свабодна расставіць апаратуру, яшчэ і месца заставалася, дзе стаялі людзі пры перапоўненай зале. Кінамеханікі Іван і Саша першымі даўмеліся на школьны комін заносіць вялізны, як дарожны чамадан, дынамік, і ён падвячоркамі на ўсю ваколіцу гарлаў сучасныя песні. Што ні кажы, было весела. Стракатаў рухавічок кінаперасоўкі, над Малым Сялом разлягалася эстрада, да школы збягаліся начапураныя дзяўчаткі, прыбраныя кавалеры. Калгасны старшыня Мікалай Міхайлавіч Лабада зрэдку аплачваў сеанс з грамадскай касы, і тады які-небудзь цікавы фільм ставілі пад адкрытым небам, на пляцы перад школай. Запомнілася на ўсё жыццё, як на свежым паветры я глядзеў прыгодніцкі фільм па рамане Жуля Верна «Тайна вострава Бэк-Кап».

Калі па шчырасці, то для падобных і нейкіх іншых відовішчаў школьны двор быў занадта малы і зусім непрыстасаваны. Той жа спартыўнай пляцоўкі ледзь

хапала, каб расцягнуць валейбольную сетку і пагуляць у мяч. Тут можна было паскакаць у «класікі», паганяць кацёлку, знайсці якую іншую забаву. Адразу за агароджай, на рагу вуліцы і палявога прасёлка, настаўнікі і вучні ўскопвалі круглую клумбу, афармлялі як трэба, і ўсю цёплую восень клумба цвіла буйнымі сінімі, жоўтымі, чырвонымі кветкамі. Аднойчы збоку  я прагроб глыбокую норку і хаваў там звычайную анучку, каб не забываць дома, калі дзяжурыў. Спатрэбілася неяк працерці чорную грыфельную дошку — пайшоў узяць анучку, засунуў руку ў норку і выцягнуў за лапку на сваё здзіўленне і жах вялізную жабу-карабуху. Тая імгненна скокнула дзесьці пад плот, а я паджгаў у свой клас ашалела і без аглядкі.

З другога, заходняга, боку, перад самымі вокнамі пачынаўся наш агародчык, чатыры грады — па адной на кожны клас. Цёплымі веснавымі днямі мы ўскопвалі свае надзелы, часцей за ўсё сеялі якія-небудзь някідкія касачы, крокасы, яркія мальвы. Далей на шырыню двара стаяў плот, і больш тут нічога не было, акрамя стромай туалетнай будкі ў канцы пляца. Уперадзе, за агароджай, на даволі значнай плошчы, у старажытныя часы, відавочна, плёскалася возера, але з цягам стагоддзяў абмялела, ператварылася ў звычайны лужок, зарослы высокім аерам і рознай непатрэбшчынай.

Збоку лужка, у торфе, калісьці была выкапана сажалка, дзе адзін толькі аер разросся, што яго рыжыя карэнішчы нагадвалі вялікіх і тоўстых вужоў. Пасля асенніх шчодрых дажджоў катлавіну залівала вадой, так было і пасля бурнага веснавога разводдзя, але ўзімку лужок надоўга ператвараўся ў прыродны лядовы каток, дзе ў светлыя вечары дзіцячыя баталіі на самаробных каньках не спыняліся да позняй ночы. Рыба ў гэтым дзіўным вадаёме не вялася, затое шмат было азёрных і сажалкавых жаб, якія з прыходам веснавога цяпла наладжвалі свае канцэрты на ўсю вёску.

На размежжы з пачатковай школай, акурат насупраць зарослага аерам лужка, толькі з другога боку селавой дарогі, ужо на пляцы колішняга фальварка, у наш час была яшчэ адна сажалка-копанка. Нізкія, роўныя і на дзіва прамыя берагі, не гразкае, пясчанае дно, без якой-небудзь балотнай раслінасці — на цэлае лета яна служыла пристанішчам для навакольнай дзятвы. У чыстай, хоць і непраточнай, вадзе мы купаліся ў спёку, загаралі, часам голымі рукамі лавілі серабрыстых рыбак, знаходзілі ўсялякія іншыя гульні і забавы, а ў змрочную сажалку, зарослую вужовымі карэнішчамі аеру, не лезлі. Палохала сама чорная вада, дзе плаваць перашкаджалі кіпы зялёнай раскі і жабурыння. Цяпер нашай сажалкі няма.

За селавой дарогай, непадалёк ад копанкі, у мой час яшчэ стаялі сялібы спадчыннікаў былых уладальнікаў фальварка — братоў Мечыслава і Чэслава Жыбуртовічаў, а паміж іхнімі хатамі туліўся невялікі домік, у якім жыла іх маці, пані Жыбуртовіч, як яе называлі суседзі. За доўгія ваенныя і пасляваенныя гады рэшткі фальварка прыйшлі ў поўнае запусценне, ператварыліся ў звычайную пустку, толькі нейкім цудам ацалеў знешне здаровы будынак, дзе на пачатку 50-х месцілася вясковая крама. Калі ў каго завялася якая капейчына, сюды мы, вучні пачатковай, бегалі на перапынках купіць пячэннікаў ці кулёк цукерак-падушачак, а наш аднакласнік, пераростак Коля, кожны раз прасіў у крамшчыка Валодзі Белага: «Валодзя, дай папяросак — заўтра прынясу яецка!»

Вось так мы і жылі ў тую зацяжную пасляваенную разруху — няхай дрэнна апранутыя, зналі нішчымніцу, але не скардзіліся, што камусьці сумна, нявесела. Дзяцей са сваім розным лёсам у Малых Кругавічах было шмат. Вясковыя вуліцы сціхалі адно познім вечарам альбо калі ішоў буйны дождж. Помніцца, у мой першы клас на вучобу бацькі прывялі больш як дваццаць аднагодкаў —

**Галіна Часлаўская**

# «ЖЫЦЦЁ ТАКОЕ ЦІКАВАЕ, ШТО І НЕ ВЕДАЕШ, ЗА ШТО ЎЗЯЦЦА»

*Дыяменты Васіля Шашалевіча*



**Васіль Шашалевіч**

Ва ўспамінах Заіра Азгура ёсць раздзел «Сёстры, браты...», прысвечаны сям'і Шашалевічаў.

«Гэтыя мае старонкі — пра Шашалевічаў, якія знаходзіліся ў сваяцтве духа. Родныя і стрыечныя браты і сёстры, яны склалі атрад творчых работнікаў.

Мне было гадоў шаснаццаць, калі наш цудоўны скульптар Аляксандр Васільевіч Грубэ сказаў мне, што і яго жонка Анастасія займаецца ваяннем. Анастасія Шашалевіч — скульптар. Работы яе выстаўляліся, і я ведаў некаторыя з іх. Само прозвішча Шашалевіч нагадала мне пра ўражанні ад газетных публікацый. Грубэ пацвердзіў. Так яно і ёсць: два браты — Васіль і Андрэй — літаратары. (Андрэй друкаваўся пад псеўданімам «А. Мрый».) Абяцаў пазнаёміць з імі.

Не ведаю, чым гэта і патлумачыць, але ў мяне адразу ўзнікла жаданне вылепіць партрэты гэтых братоў. Я яшчэ не бачыў іх, а ўжо адчуваў жаданне ўвекавечыць іх аблічча...».

Найбольш Заір Азгур пасяброваў з Васілём Шашалевічам. Яшчэ скульптурны партрэт, выкананы Анастасіяй Шашалевіч, уразіў: «Хударлявы твар неяк няўлоўна сімпатычны, прываблівае да сябе выраз вачэй, які як бы выпраменьвае святло, нос завостраны... Я тады чамусьці падумаў, што такія людзі падобныя да прадстаўнікоў скандынаўскіх народаў: ці нарвежац, ці швед».

Заір з Васілём пазнаёміліся ў 1926-м у доме фінскага мастака Ахола Вало, які жыў на Татарскай вуліцы Мінска. Праўда, пры сустрэчы Васіль аказаўся тыповым славянінам, а не падобным да скандынава. Завязалася размова, якая перарасла ў сімпатыю і сяброўства.

«Нас зблізілі, напэўна, прафесійныя інтарэсы. Яшчэ амаль нічога не ведаючы адзін пра аднаго, мы загаварылі пра справу нашага жыцця. Ён распытваў мяне пра працы: бо я быў калегам яго сястры. Мяне цікавіла асаблівасць мыслення і творчасці пісьменніка, што абраў галоўным жанрам драматургію. Агульнавядома, што драматургія — гэта канфлікт, абавязковая сутычка характараў, тэмпераментаў, густаў, перакананняў...

Васіль Шашалевіч, як мне здавалася, — ураўнаважаны, спакойны, нават ціхі. Выбраў жа такі задзірысты жанр.

Памятаю, Васіль Антонавіч з усмешкай, але цалкам сур'ёзна адказаў на гэта:

— У свеце няма ўладкаванасці. Свет шукае яе. Змагаецца за яе. Ну, скажам, так: уладкаванасць — гэта справядлівасць. Сацыяльная. Нацыянальная. Сямейная. Маральная... А калі мяняецца парадак самога жыцця, тут такія драматычныя лёсы, што не пісаць пра іх для літаратара — грэх... Жыццё такое цікавае, што і не ведаеш, за што ўзяцца, каб напісалася добра».

Удакладніць моманты біяграфіі Васіля Шашалевіча нам дапамогуць дакументы з Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва. Там захоўваецца ліст сястры Васіля Ксеніі ад 21.02.1958, у якім яна дасылае звесткі аб браце.

«В. А. Шашалевич родился 1-го января 1897 г. ст. ст. в селе Мхиничи Могилевской губ. Чериковского уезда в семье волостного писаря 4-м ребенком. Отец умер от туберкулёза, когда мальчику было 4 года».

Ужо ёсць пра што паразважаць, бо паўсюль значыцца, што Васіль Шашалевіч нарадзіўся 9 студзеня. Сястра памылілася? Яшчэ пішуць, што калі бацька памёр, Васілю было 9 год. Зноў несупадзенне.

«Страшно нуждаясь, мать стремилась дать детям учительское образование. Сельскую школу мальчик окончил в д. Палужи 1908 г. Затем учился в духовном училище и духовной семинарии в г. Могилеве по настоянию матери... В войне по слабости здоровья (лёгкие) не участвовал, у белых не был. Был зачислен в Ярославский юридический лицей, но не учился там из-за материальных затруднений. Давал частные уроки по музыке и рус. яз. В 1917 г. поступил учителем начальной школы в дер. Ясенка Краснопольской волости».

Разам з Васілём настаўнічаюць ягоны брат Андрэй — ён праславіцца пасля пад псеўданімам Андрэй Мрый, сёстры Наста і Ксенія. Сяргей Грахоўскі ўспамінаў: «Шашалевічы стварылі першы ў раёне драматычны тэатр, у школе арганізавалі драматычны і літаратурны гурткі, выдавалі рукапісны часопіс «Пралеска». Сатырычны раздзел у ім вёў Андрэй Шашалевіч. Яны ставілі спектаклі па п'есах Астроўскага, Горкага, Чэхава для школьнай самадзейнасці, пісалі аднаактоўкі, там жа Васіль Антонавіч пачаў пісаць сваю славутую «Апраметную».

Дарэчы, дэкарацыі да спектакляў тэатра Шашалевічаў робіць яшчэ адзін выкладчык з Краснаполля, настаўнік прыродазнаўства і малявання Аляксандр Грубэ, які зробіцца мужам адной з сясцёр, будучы старшыня Саюза мастакоў БССР і народны мастак.

Ксенія Шашалевіч дапаўняе:

«В 1924 г. он едет жить и работать в Минск учителем нач. школы и 5-7 классов.

Одновременно писал.

С раннего детства он много читал.

В школе отличался своими сочинениями, его сочинения всегда зачитывались в классе, особенно помню его сочинение «Смерть отца» из воспоминаний детства.

Первое его произведение было в 15 лет «Рамафаим-Цофим», где он вывел преподавателя истории — чахоточного учителя, с большой жаждой жить, и, наперекор этому, покончившего жизнь самоубийством».

Алесь Карлюкевіч

# БАРАНАВІЧЫ. ЛІТАРАТУРНАЕ ГНЯЗДО БЕЛАРУСІ

*Старонкі будучага краязнаўчага даведніка. Заканчэнне. Пачатак у № 3 за 2025 год*

З кастрычніка 1944 па 1955 г. у Баранавіцкім настаўніцкім інстытуце працаваў выкладчыкам, а пасля загадчыкам кафедры мовы і літаратуры літаратуразнаўца, публіцыст, кандыдат філалагічных навук БРАНІСЛАЎ АНДРЭЕВІЧ РЖЭЎСКІ, які нарадзіўся 25 сакавіка 1905 г. у вёсцы Добрыцкае Вяляціцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1927 г. ён скончыў Барысаўскі педагагічны тэхнікум. Працаваў настаўнікам у школах Гомельшчыны. У 1940 г. скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут. З сакавіка 1940 па чэрвень 1941 г. працаваў дырэктарам польскай сярэдняй школы ў Баранавічах. У час Вялікай Айчыннай вайны прымаў удзел у партызанскім руху на Берасцейшчыне, на тэрыторыі тагачаснай Баранавіцкай вобласці. Спярша стварыў падпольную партызанскую групу «Барыс», якая падтрымлівала сувязь з партызанскай брыгадай імя Суворава. Затым быў прызначаны рэдактарам газеты Навамышскага падпольнага райкама КП(б)Б «Перамога». Быў знаёмы ў час вайны з Янкам Брылём, з якім потым сябраваў праз усё жыццё. У 1952 г. абараніў дысертацыю на тэму «Вобраз станоўчага героя ў творчасці Максіма Танка» (аўтарэферат дысертацыі быў аддрукаваны ў Баранавічах). З успамінаў Аляксея Міхайлавіча Пяткевіча, які быў знаёмы з літаратуразнаўцам па жыцці і працы ў Гродне: «...Пазнаёміўся з вельмі цікавым чалавекам — Браніславам Андрэевічам Ржэўскім. Літаратуразнавец, кандыдат філалагічных навук, былы выкладчык Гродзенскага педінстытута, ён нядаўна вярнуўся са зняволення і настаўнічаў у школе. Мажны, відны сабой, абаяльны, ён умеў трымацца годна, быў добрым суразмоўцам. Жылі яны з жонкай (дзеці былі ўжо студэнтамі) у старым драўляным доме пад высокай ялінай на ціхай вуліцы з прыгожай назвай — Цагляная. Пры доме быў вялікі агарод, заўсёды старанна дагледжаны гаспадыняй — настаўніцай біялогіі, што мела, між іншым, званне заслужанай настаўніцы БССР. У самым кутку агарода стаяў будан, густа аплецены вінаградам. Тут Браніслаў Андрэевіч і бавіў час ад вясны да восені: любіў прыроду. Тут я яго даволі часта адведваў, чаму гаспадар быў вельмі рады. З былых сяброў-калег рэдка хто сюды заглядваў. Ведалі: дом пад пільным наглядам адпаведных службаў. У гэтым будане мы з ім, бывала, і частаваліся. Але найбольш ён распавядаў пра сваё жыццё. Ваяваў ён у партызанах. А пасля прызвычаіўся трымацца па-баявому. Не скрываў сваіх нацыянальна-патрыятычных і грамадзянскіх поглядаў. А пасля асуджэння культу Сталіна публічна называў яго тыранам, клікаў беларусаў да свабоды (у сваіх вершах), пісаў выкрывальныя лісты на адрас кіраўніцтва БССР. У сакавіку 1957 г. яго «забралі» ў памяшканні інстытута. Толькі скончыў лекцыю і выйшаў у калідор, як да яго падышлі двое ў цывільным, і дамоў ужо не змог вярнуцца. Суд прызначылі на дзень яго нараджэння. Далі восем гадоў «за антысавецкую дзейнасць». Праўда, праз чатыры гады справу перагледзелі, і ён вярнуўся ў Гродна. Але дарога ў педінстытут і на старонкі друку была перад ім закрыта. Выпісваў усю беларускую літаратурную прэсу. Шмат чытаў. Аднойчы, распавядаў, напісаў і паслаў у «Полымя» рэцэнзію на раман А. Асіпенкі «Непрыкаяны маладзік». Быў канец 70-х, можа, надрукуюць:

прайшлі ж многія гады. Праз нейкі час паехаў у Мінск і зайшоў у рэдакцыю часопіса. Сустрэў яго Алесь Бачыла і вельмі цёпла з ім пагутарыў пра жыццё. Толькі падчас гутаркі рукапіс Ржэўскага, што ляжаў на стале, далікатна ўсё падсоўваў аўтару. І калі падсунуў да самых рук, гутарка скончылася. Прайшлі гады. Браніслаў Андрэевіч стаў цяжка хварэць, ляжаў у бальніцы. Там і памёр. За памінальным сталом было шмат яго баявых сяброў, якія гаварылі пра яго партызанскія заслугі...»

У Баранавічах у 1944 г. адказным сакратаром аблспорттаварыства «Дынама» працаваў празаік АЛЕСЬ РЫЛЬКО.

10 жніўня 1942 г. у Баранавічах нарадзіўся польскі кінарэжысёр, фатограф, мастак, тэарэтык мастацтва, пісьменнік АНДЖЭЙ РУЖЫЦКІ. У 1966 г. скончыў факультэт выяўленчага мастацтва ва ўніверсітэце імя Мікалая Каперніка ў Варшаве, а ў 1975 г. — рэжысёрскі факультэт кінашколы ў Лодзі. З 1966 г. — член Асацыяцыі польскіх фатографаў. Аўтар болей чым 50 фільмаў па этнаграфіі і мастацтве.

У Баранавіцкай абласной газеце «Чырвоная звязда» ў 1945—1953 гг. працаваў паэт, празаік РАМАН САБАЛЕНКА, аўтар многіх кніг.

У Баранавічах жыве паэтэса АЛЬБІНА САЛАВЕЦ (нарадзілася 29 красавіка 1937 г. у Кандалакшы Мурманскай вобласці, Расійская Федэрацыя), аўтар кнігі вершаў «Волшебная осень и радость и грусть» (2009).

У 1958 г. Баранавіцкае медыцынскае вучылішча скончыў пісьменнік, журналіст, краязнавец, кнігавыдавец ВАЛЕР САНЬКО (1939—2020), які нарадзіўся ў вёсцы Вялікая Сліва Слуцкага раёна, на Міншчыне. Працаваў у газетах «Чырвоная змена», «Звязда», у выдавецтвах «Беларусь», «Народная асвета», «Полымя». Быў дырэктарам заснаванага Беларускім дзіцячым фондам Беларускага выдавецкага Таварыства «Хата» (1992—2006). Аўтар рамана «Звіняць жаўрукі ў Чарнобыльскім небе», аўтар кніг «Жыватворныя крыніцы», «Не плач, маці», «Ненадрукаванае ў белдзяржлітструктурах», «Грэх на іх нязмыўны», «Карыды вогненныя іскры», «Прыкмета і прырода — сябры назаўсёды» і інш. Памёр 22 лістапада 2020 г. Пахаваны на могілках вёскі Вялікая Сліва Слуцкага раёна.

У Баранавічах жыў і працаваў журналіст, публіцыст ВАСІЛЬ ЕМЯЛЬЯНАВІЧ САМУЦІН (1906—1981), які нарадзіўся ў вёсцы Ваўчыны Перавоз Валынскай губерні (Украіна). З 1946-га па люты 1949 г. — другі сакратар, а з лютага 1949-га па ліпень 1950 г. — першы сакратар Баранавіцкага абкама КП Беларусі. У 1930—1931 гг. — галоўны рэдактар газеты «Чырвоная змена». У 1931—1933 гг. — начальнік партыйнага аддзела газеты «Звязда», у 1939—1941 гг. — намеснік галоўнага рэдактара газеты «Знамя Свободы». У Вялікую Айчынную вайну — галоўны рэдактар падпольнай газеты «Віцебскі рабочы», галоўны рэдактар беластоцкай падпольнай газеты «Вольная праца». У 1944—1945 гг. — галоўны рэдактар газеты «Звязда», у 1945—1946 гг. — галоўны рэдактар газеты «Советская Белоруссия». Узнагароджаны ордэнам Леніна. Заслужаны дзеяч культуры БССР (1967).

У Баранавічах жыў і працаваў паэт АНАТОЛЬ СТАНКЕВІЧ (нарадзіўся 2 сакавіка 1937 г. у вёсцы Жарабковічы Ляхавіцкага раёна). У 1955 г. скончыў Слонімскае рамесніцкае вучылішча чырванадрэўшчыкаў. З 1959 г. жыў і працаваў у Баранавічах. Пісаў вершы на беларускай і рускай мовах. У 1972—1980 гг. узначальваў баранавіцкае літаратурнае аб'яднанне «Плынь». У 1989—1993 гг. кіраваў працай літаб'яднання «Ліра» пры Баранавіцкім палацы культуры і тэхнікі. У 1994 г. стварыў літаратурнае аб'яднанне «Жнівень» на Баранавіцкім станкабудаўнічым заводзе. Аўтар кніг «Билет до станции Счастье» (1983), «На крыльях страдающей совести» (1996). З красавіка 1999 г. — член Саюза пісьменнікаў. Пайшоў з жыцця 21 кастрычніка 1999 г. Ужо пасля смерці паэта па-

бачылі свет яго кнігі «Скрыжалі дабрыні» (2010), «Поэзия, я жил тобой» (2018). У 2010 г. на доме, дзе жыў паэт, усталявана мемарыяльная дошка.

У 1906 годзе ў Баранавічах нарадзіўся яўрэйскі паэт ЛЕЎ ТАЛАЛАЙ.

У 1926 годзе праездам у Баранавічах быў рускі пісьменнік АЛЯКСЕЙ ТАЛСТОЙ.

У Баранавічах 16 гадоў працаваў рэдактарам шматтыражнай газеты «Тэкстыльшчык» ГЕОРГІЙ ТАМАШЭВІЧ (нарадзіўся ў 1939 г. у вёсцы Далкінды каля Нясвіжа, на Міншчыне), аўтар паэтычных зборнікаў «Жытнёвае слова» (2007), «Новы дзень» (2009), «Шлях» (2015), «Анёл над Брэстам» (2019). Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя У. Калесніка (2019).

26 студзеня (8 лютага) 1914 г. нарадзіўся ў Баранавічах паэт, літаратуразнавец ВАЛЯНЦІН ТАЎЛАЙ. Яго імя нададзена Баранавіцкай цэнтральнай гарадской бібліятэцы. Ёсць у Баранавічах і вуліца імя Валянціна Таўлая.

У 2004—2007 гг. у Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце выкладаў публіцыст, літаратурны крытык, літаратуразнавец АНАТОЛЬ ТРАФІМЧЫК (нарадзіўся 14 лютага 1976 года ў вёсцы Вялікія Круговічы Ганцавіцкага раёна). Кандыдат гістарычных (2004) і філалагічных (2014) навук. Аўтар паэтычных зборнікаў «Пасведчанне аб нараджэнні», «Ноты цноты», «Лірыка» (кніга пабачыла свет у Баранавічах у 2007 г.), манаграфій і гісторыка-літаратурных, публіцыстычных кніг «Пра нашу і вашу гісторыю» (выйшла таксама ў Баранавічах у 2011 г.), «Якуб Колас — вядомы і невядомы» (2012), «Беларуская дзіцячая драматургія» (2012), «Ленін і Сталін думаюць пра Беларусь» (2013) і інш.

У 1953 г. у Баранавічах нарадзілася паэт ТАЦЦЯНА ТРАФІМЧЫК.

У Баранавічах жыве паэтэса КЛАЎДЗІЯ ТРЫСЦЕНЬ (нарадзілася 13 красавіка 1941 г. у вёсцы Зеляночы, на Гомельшчыне), аўтар паэтычных кніг «Если б я знала...» (2009), «Мелодия сердца» (2016), «Слова связывают людей» (2016). Кандыдат медыцынскіх навук. Працавала ў Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце.

У Баранавічах разам з бацькам Карпам Сцяпанавічам (маці — Вольгу Пятроўну Харчанку — фашысты забілі на вачах у сына) жыў паэт АЛЕСЬ ШЛЕГ (нарадзіўся 15 кастрычніка 1936 г. у вёсцы Вялікі Бор Хойніцкага раёна, на Гомельшчыне). Скончыў 7 класаў СШ № 1. Працаваў электразваршчыкам у Баранавіцкім паравозным дэпо. У 1958—1959 гг. працаваў у ляхавіцкай раённай газеце «Савецкі патрыёт». Паступіў у Баранавіцкую завочную сярэднюю школу і здаў экстэрнам экзамены. У 1959 г. у часопісе «Маладосць» былі змешчаны «абразкі жыцця» «Так нараджаецца сталасць» Алеся Шлега. Пісьменнік — аўтар кніг «Трывожная памяць», «Цыганок», «Праўда адна», «Жыло чаканне болю», «Хлеб на далонях тваіх».

У розныя гады Баранавічы наведваў паэт, празаік, перакладчык ВІКТАР ШНІП. Пра «свае» Баранавічы пісьменнік расказвае на старонках рамана-дзённіка «Заўтра была адліга»:

«...7.10.2015. З Людмілай вечарам былі ў Баранавічах, дзе сустракаліся з нашымі чытачамі.

Ехалі на цягніку Мінск — Гродна. У плацкарце было поўна людзей. Большасць сядзела, уткнуўшыся вачыма ў камп'ютары і смартфоны. Не вагон, а камп'ютарны клуб на рэйках...

У цягніку даўно не ездзіў, нібыта не ўцякаў ад сябе самотнага...

Станцыя «Асіна». Лес. На ўзлессі ляжыць бярозавае паленне...

Праехалі Стоўбцы. На прыпынку на лаўцы ў чорным капелюшы і скураным плашчы сядзеў пажылы мужчына, падобны на Якуба Коласа. Чытаў «Нашу Ніву»...

Каля чыгункі выкарчаваныя вялізарныя пні, як тутэйшыя мёртвыя васьміногі...

Згадаўся Мікола Купрэеў, які любіў ездзіць на цягніках. Разумею ягоную любоў. Едзеш, глядзіш праз акно на наваколле і адчуваеш сябе вольным ад тлуму жыццёвага. Цягнік імчыць. Нас ніхто не дагоніць!

Выпіў дзве шклянкі вагоннай гарбаты. У думках памаладзеў на гадоў трыццаць. Згадаў даўнія паездкі ў Маскву на вучобу ў Літінстытут. Тады я начамі ніколі не спаў. Мэнчыўся ўсю дарогу без занятку. Цяпер бы сядзеў у інтэрнэце...

У пустых шклянках танцуюць лыжачкі. Ім таксама добра...

На палях ужо зжата кукуруза. Кукурузныя пянькі стаяць, як патухлыя свечкі...

У Баранавічах на вакзале нас сустрэлі. Паглядзелі на горад. Месцамі прыгожа, а месцамі сумнавата.

У бібліятэцы расказалі пра сябе, чыталі вершы, адказалі на пытанні, падпісалі кнігі. У 21.41 выехалі з Баранавіч. Едучы дадому, гаварылі пра шчырых, светлых, таленавітых хлопцаў і дзяўчат, якія прыйшлі на сустрэчу з намі. Дарожны час за размовай праляцеў хутка. Гарбата ў цягніку Брэст — Масква была не горшай, чым у Мінск — Гродна, але ў плацкарце было цяплей, чым у купэ...»

«15.01.2017. Ездзіў у Пінск да сына.

Маршрутка з Мінска амаль поўная. Усе драмалі. Я таксама нейкі час да Баранавіч сядзеў зажмурыўшыся. Думаў пра дзяцей, бацькоў, сваякоў і пра зіму. А потым глядзеў на заснежанае наваколле ў спадзяванні ўбачыць дзікае паляванне караля Стаха...

Дрэвы ў шэрані, як намаляваныя. Некаторыя краявіды, як карціны Валерыя Шкарубы, рэпрадукцыямі якіх аздабляецца кніга паэзіі Міхася Стральцова...

Рыбакі на азярыне, як прымерзлыя. Сядзяць заінелыя, нібыта з мінулага года...

Сонца за аблокамі прасвечваецца ледзь-ледзь. Яно, як злепленае са снегу пажаўцелага...»

«25.05.2017. Патэлефанавала з Баранавіч незнаёмая школьніца. Прыедзе па кніжкі Людмілы Рублеўскай для сваёй настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Галіны Мікалаеўны. Людміла падпісала «Ночы на Плябанскіх млынах» і «Дагератып», а я «Заўтра была адліга» і «Пугачоўскага цырульніка».

Са школьніцай сустрэўся каля станцыі метро «Няміга». Алеся заканчвае 11 клас. Будзе паступаць на журфак. Піша вершы. Яе настаўніца беларускай мовы і літаратуры вельмі любіць прозу Рублеўскай, і дзяўчына вырашыла для яе зрабіць памятны падарунак».

«21.02.2019. Дзень роднай мовы. Быў у Ляхавічах у гімназіі.

А дзясятай выехаў маршруткай Мінск — Баранавічы. Дарога мне вельмі знаёмая. Ездзіў да сына, калі ён паўтара года служыў у Пінскім памежным атрадзе.

За Дзяржынскам няма снегу. І ўжо даўно няма. На калюгах лёд. І чым далей ад Мінска, тым сонечней. На полі на грудах бачыў некалькіх арлоў. Сядзяць, як спяць.

Каля дарогі могілкі. Штучныя кветкі. На дрэве крумкач, як вартаўнік.

У рудой траве чорнае кратавінне, як гнёзды.

Нёман. Каля берагоў лёд. У затоцы белыя лебедзі. Як са снегу.

Неба і ўсё навокал напоўнілася сонечным святлом. І я глядзеў увыш з надзеяй убачыць жаўрукоў і пералётных гусей. Але яшчэ вельмі-вельмі рана ім вяртацца. Яшчэ люты. І ён можа ў любы дзень у кожнага з нас спытаць: «Ці добра абуты?»

У маршрутцы дзесяць чалавек. Амаль усе дрэмлюць. А я згадваю, як ездзіў да Максіма. Часам, здаецца, што еду ў Пінск, дзе служыць сын.

На вакзале ў Баранавічах мяне чакаў з машынай настаўнік з Ляхавіцкай гімназіі. Вецер. Заехалі ў родную вёску Алеся Бадака Туркі. Алесь сёе-тое перадаў для маці. Вёска невялікая. Цішыня. Пад'ехалі да хаты Алеся. Загаўкаў сабака. Выйшла Алесева маці. На нейкі момант падалося, што з хаты выйшла мая мама, якая цяпер жыве тут.